незалежная газета
№ 21 (666) 2 чэрвеня 2010
www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



3+2=0

Старонка 10



Рыбак зачапіў вудай высакавольтную ЛЭП

Старонка 6



У заложніках у «Аднакласніках»

Старонка 15

## У НУМАРЫ

**Саскочылі ў апошні момант**
Расія і Казахстан падпісалі Мытны кодэкс без Беларусі. **Старонка 4.**

**ДФР завёў справу на распаўсюдніка беларускамоўнай прадукцыі**
У поле зроку фінансавай міліцыі трапілі «Кнігі — поштай». **Старонка 5.**

**Сквер на Людажэрскай і помнік Чыкацілу**
Перайменаванне вуліц і дэмантаж савецкіх помнікаў — справа нацыянальнага гонару. Піша Алесь Чайчыц. **Старонка 7.**

**У саламяных лялек з’явіліся канкурэнты**
Новыя сувеніры на беларускую тэматыку. **Старонка 11.**

**Хваёвая ванна Свіцязі і ўсё, што навокал**
Маршруты па Беларусі. **Старонка 8.**

КНІГІ, ВІДЭА, МУЗЫКА — ПОШТАЙ
www.knihi.net

# «Стоп-бензін. Мы не дойныя каровы!»

Пратэст супраць даражэння бензіну. Аўтамабілісты байкатуюць запраўкі. **Старонка 4.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Парад кандыдатаў

Цэлы дзясятак дзеячаў апазіцыі гатовы ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах.

Толькі ў панядзелак пра свае амбіцыі заявілі тры чалавекі — Яраслаў Раманчук з Аб’яднанай грамадзянскай партыі, генерал Фралоў і актывіст Партыі зялёных. Відавочна, што далёка не ўсе дойдуць нават да этапу збору подпісаў.

Вылучэнне сваіх кандыдатаў для партый — гэта добрая магчымасць выгандляваць лепшыя пазіцыі ў камандах мацнейшых палітыкаў. А таксама заявіць пра сваю прысутнасць на палітычнай арэне.

Пустыя кандыдаты адсейваюцца на этапе збору подпісаў.

У трох папярэдніх прэзідэнцкіх кампаніях ні разу больш за два дэмакратычныя кандыдаты не збіралі неабходных сто тысяч подпісаў. 1994 — Зянон Пазняк і Станіслаў Шушкевіч, 2001 — Уладзімір Ганчарык і Сямён Домаш, 2006 — Аляксандр Мілінкевіч і Аляксандр Казулін.

Сёлета наймацнейшыя пазіцыі маюць усё той жа Мілінкевіч, а таксама імаверны кандыдат, падтрыманы кампаніяй «Гавары праўду», — хай гэта будзе Уладзімір Някляеў ці нехта іншы. Іншым прэтэндэнтам, хутчэй за ўсё, давядзецца далучыцца да кампаній гэтых палітыкаў.

**Зміцер Панкавец**

АГП вылучыла ў прэзідэнты эканаміста-ліберала Яраслава Раманчука. Партыя БНФ — камунальніка Рыгора Кастусёва, земляка Аляксандра Лукашэнкі. Свайго кандыдата маюць Зялёныя. А Алесь Міхалевіч вылучыў сябе сам і робіць стаўку на моладзь. **Старонка 3.**




# Футбол па-чорнаму

Чэмпіянат свету можа стаць асаблівым: незвычайную гульню на роднай зямлі здольныя паказаць афрыканцы.

Ад 11 чэрвеня да 11 ліпеня ў Паўднёвай Афрыцы пройдзе 19-ы чэмпіянат свету па футболе. Упершыню спаборніцтва такога рангу прымае Чорны кантынент.

З гэтай нагоды і афрыканскіх камand на мундыялі будзе рэкордна шмат — цэлых шэсць. Апроч ПАР, удзел возьмуць Гана, Нігерыя, Алжыр, Камерун, Кот-д’Івуар.

Апошнюю каманду ўзначаліў вядомы шведскі спецыяліст Свен-Горан Эрыксан. Але «сланам» зноў не пашанцавала з лёсаваннем. Другі чэмпіянат запар яны трапляюць у «групу смерці».

Чатыры гады таму краіна слановай косткі не змагла выйсці з групы, дзе трапілася Галандыя, Аргенціна і Сербія. Сёлета фартуна падрыхтавала ім у суперніцы Бразілію, Партугалію і КНДР. Адзіная надзея — на найлепшага бамбардзіра англійскай прэм’ер-лігі Дзідзье Драгбу.

Афрыканскія зборныя звычайна паказваюць незвычайны футбол — трохі бессістэмны і карнавальны. Асалода.

Паўночныя карэйцы на сусветнае першынство трапілі толькі ў другі раз. Упершыню яны ўдзельнічалі ў чэмпіянаце 1966 года ў Англіі. Зборная непрафесіяналаў выклікала сапраўдны шок у заўзятараў.

Спачатку карэйцы прайгралі СССР — 0:3 (два галы тады забіў будучы трэнер зборнай Беларусі Эдуард Малафееў). Потым згулялі ўнічыю з Чылі. А ў вырашальным групавым матчы абсалютна нечакана перамаглі Італію — 1:0. На Апенінах тая гульня і сёння лічыцца адной з найбольш драматычных у гісторыі «скуадры адзуры».

**Працяг на старонцы 5.**

«Наша Ніва» з’яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
«ГІСТОРЫЯ-ТУР»
Карпаратыўны адпачынак у фальварку Карчэўскіх у Банюнах!
Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі!
Адпачынак на моры і ў Еўропе!
Тур на фестываль: "Навагрудскі замак" (26-27.06. 2010, Навагрудак)!
Тур "Шлях на Грунвальд": Лідзбарк Вармінскі – Ольштын – Мальбарк – Грунвальд (13-18.07.2010, Польшча)!
(029) 677 00 46
www.h-t.by

# Тысячы інтэрнаўтаў звярнуліся да Лукашэнкі

Просяць адмяніць указ пра рэгуляванне інтэрнэту.

1 ліпеня мае ўступіць у сілу нашумелы ўказ №60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт». Ён быў падпісаны 1 лютага, а ў красавіку Саўмін прыняў шэраг растлумачальных пастановаў да яго. Карыстальнікі інтэрнэту пабачылі ў іх спробу прыдушыць сецівa.

Яны звярнуліся да кіраўніка краіны з лістом пратэсту, размясціўшы яго на сайце ukaz60.net.

Выказаць сваё стаўленне да гэтага дакумента можа кожны. На момант напісання матэрыялу, за дзень, гэта зрабілі 1500 чалавек.

У адкрытым лісце да Лукашэнкі адзначаецца, што ўказ можа негатыўна паўплываць на прыток у краіну капіталу міжнародных тэлекамунікацыйных кампаній. Акрамя гэтага, паводле меркавання актывістаў, інтэрнэт пазбаўляецца галоўнай перавагі — даступнасці, хуткасці, бо нават для рэгістрацыі адраса электроннай пошты спатрэбіцца працяглы тэрмін замест звычайных дзвюх хвілін.

**АП**

## Немцам прыйдзецца няпроста

Фестываль нацыянальных культур у Гродне сёлета прысвечаны 65-годдзю перамогі.

Гэтае свята ладзіцца раз на два гады і слыве сваёй відовішчнасцю. 4—6 чэрвеня Гродна ператворыцца ў вялікую пляцоўку, на якой сябе прадэманструюць розныя этнасы нашай краіны.

Сёлета ім прыйдзецца асабліва пастарацца, «бароначы касцюмы». Фестываль упершыню стане тэматычным і будзе прысвечаны 65-годдзю перамогі ў вайне. Кожная нацыянальнасць мае якімсьці чынам ушанаваць перамогу. Складаную задачку задалі арганізатары афганцам, палесцінцам і немцам.

Кульмінацыяй свята стане закладка капсулы з пасланнем да нашчадкаў. Дарэчы, Фэст нацыянальных культур стане першым вялікім «выхадам у свет» для новага кіраўніка Гарадзеншчыны Сямёна Шапіры. Пры Саўчанку чынавенства на свяце звычайна адпачывала душой і дазваляла сабе махнуць чарку-другую ў засені нацыянальных падворкаў.

Акрамя новага начальніка, гарадзенцы пабачаць на фестывалі канцэрт нестарэючага Алега Газманава, калінінградца па нацыянальнасці.

Сёлетні фэст будзе сціплейшы за папярэднія. Вінаваты ў гэтым не толькі крызіс – у Лідзе павінны адбыцца Дажынкі, адпаведна і сродкі з абласнога бюджэту перацяклі на фарбаванне лідскіх сцен.

Не абыходзіцца і без скандалаў. Палякі, якія адчуваюць асаблівы клопат беларускай дзяржавы, «пойдуць дзвюма калонамі»: афіцыйнай і неафіцыйнай.

Усе гады свайго існавання Фестываль нацыянальных культур быў прыкладам таго, як цудоўную ідэю можна ператварыць у саўковы трэш. Падобна на тое, што сёлета выключэння не будзе.

**Алесь Пілецкі**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



GAZETABY.COM

## На «Славянскім базары» — Lena Meyer, «Тройца», J:морс

На фестывалі ў Віцебску, які пройдзе 9—15 ліпеня, чакаецца выступленне пераможцы «Еўрабачання» **Лены Маер (на фота)**. Пра гэта паведаміў рэжысёр канцэрта адкрыцця фестывалю Глеб Шапа.

Яшчэ адной адметнасцю арганізатары назвалі выступленне балета Алы Духавай «Todes» пад аранжаванні «Купалінкі» і «Крыжачка». Што тычыцца ўдзелу айчынных выканаўцаў, то на фоне традыцыйных поп-артыстаў вылучаюцца «Тройца» і J:морс. Прычым апошні гурт на сцэну падымецца тройчы: у дзень адкрыцця і закрыцця фестывалю, а таксама ў межах беларускага дня.

**Кастусь Матушчыч**

### Самае чытанае на nn.by за 26 мая—1 чэрвеня

- У Вяснянцы рыбак зачапіў вудай ЛЭП
- Жонка Някляева маладзейшая за яго дачку
- Аляксандр Рыбак заявіў, што ён гей?
- Міхалевіч прэзентаваў сваю праграму ў Ратушы, але па-расійску
- На «Еўрабачанні-2010» перамагла Лена Маер з Германіі
- Эканаміст-ліберал Яраслаў Раманчук вылучаны кандыдатам ад АГП
- БНФ будзе змагацца на двух франтах — супраць Лукашэнкі і прарасійскага кандыдата
- ДФР завёў справу на распаўсюдніка беларускамоўнай прадукцыі
- Восем жаночых жэстаў, якія выдаюць жаданне
- Восем перавагаў ранішняга сэксу

### nn@nn.by

Паважаны Рэспубліканскі гідраметэацэнтр! Прашу вас настолькі панізіць тэмпературу навакольнага асяроддзя, каб вымерзлі дзьмухаўцы на маім участку — бо ўжо замучыўся здымаць ураджай гэтага года, а лета ж яшчэ толкам не наступіла...

**Кнехт**

### Удакладненне

Алесь Лагвінец не пляменнік Віктара Лагвінца, як было пададзена ў «НН» №20, а ягоны траюрадны брат, хоць і малодшы. Таксама ён, у адрозненне ад напісанага, падтрымлівае кантакты са сваяком. Напрыклад, бачыўся з ім на апошнюю Радуніцу, калі ўвесь род Лагвінцоў збіраецца на могілках вёскі Дворышча Хойніцкага раёна, што трапіла ў чарнобыльскую зону. Таксама, на думку Алеся, ацэнка кошту маёмасці Віктара Лагвінца моцна перабольшаная.

Просім прабачэння за недакладнасці.

### Сцісла

• **Сафія зачыняецца на рэстаўрацыю.** Праект разлічаны на тры гады і ўключае замену кроквaў, аконных блокаў, рамонт фасада Сафійскага сабора ў Полацку. Гэтым летам доступ у музей будзе закрыты. Знакаміты полацкі арган падновяць спецыялісты з Германіі.

• **Горача і навальнічна.** 2—3 чэрвеня па краіне будзе воблачна з праясненнямі. 3 чэрвеня днём на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы. У паўднёвых раёнах — моцныя, магчымы град. Месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ноччу плюс 13—18°С, днём плюс 22—28°С, пераважна па ўсходняй палове да плюс 30°С. 4 чэрвеня дажджы працягнуцца. У асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ноччу плюс 13—18°С, днём плюс 16—23°С, па ўсходзе плюс 24—26°С.

• **Цэны на кватэры знізіліся на 3,2%.** Сярэдняя цана прапановы квадратнага метра на другасным рынку жылля ў сталіцы складае 1386 даляраў. Гэта на 3,2% менш, чым на пачатку года.
Кватэры ў новабудоўлях Мінска прапаноўваюць па цэнах ад 700 да 3 тыс. даляраў за метр. Сярэдняя цана долевага будаўніцтва складае 1286 даляраў за кв. м, што на 3,5% больш, чым у пачатку года.
Для параўнання: у Кіеве сярэдняя цана складае на другасным рынку 2226 даляраў за кв.м. У Маскве — 4431 даляр.

• **Уладальнікі інтэрнэт-крамаў да 30 чэрвеня павінны зарэгістравацца.** У сувязі з уступленнем у сілу пастановы Савета Міністраў, з 1 ліпеня юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі будуць весці розьнічны гандаль праз інтэрнэт-крамы, зарэгістраваныя ў Гандлёвым рэестры. Для рэгістрацыі яны абавязаныя да 30 чэрвеня звярнуцца ў рэгіструючы орган. Устаноўленыя стаўкі адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў і фізічных асоб. Памер плацяжу залежыць ад віду дзейнасці. Так, максімальная стаўка адзінага падатку (Br1,23 млн у месяц) прымяняецца пры рознічным гандлі праз інтэрнэт аўта- і мотатранспартам. На адзенне са скуры яна складае Br920 тыс., мэблю, бытавую тэхніку, камп'ютары, мабільныя тэлефоны, парфумерыю, будматэрыялы — Br530 тыс., мяса, каўбасы — Br440 тыс., хлеб, малако — Br200 тыс.

• **Работніца іграваога клуба «навяла» сябра на сейф з выручкай.** Ён і арганізаваў злачынства. Хлопец падключыў двух знаёмых, адзін з якіх вартаваў на вуліцы, а другі прабраўся ў памяшканне і выкраў з сейфа больш як 4,5 млн рублёў. Выканаўца злачынства аддаў дзяўчыне-наводчыцы 600 тыс. рублёў.

**СМ; БелаПАН, БЕЛТА**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Сурoдзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252.

Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Анатолю С., Івану К., Алене М., Сяргею М., Ю.Я., А.Р., Уладзіміру Л., Кірылу М., Рыце Н., І.С., С.К., Валянціне Л., Пятру Л., В.Я., Ігару Б., Дзмітрыю Х., В.З., Ю.В., А.К., Аляксандры Д., Яўгену Ш., А.Б., Раману П. з Мінска. Міхаілу Ш. з Клімавіцкага раёна. А.Б. са Шчучынскага раёна. Валерыю Т., В.Г., А.Г., А.А. з Мінскага раёна.

# У Маскве сказалі: «Вы не нашы людзі»

**31 мая ў гатэлі «Еўропа» Аб'яднаная грамадзянская партыя вылучыла ў прэзідэнты эканаміста–лібэрала Яраслава Раманчука.**

Перад гэтым кандыдатура Раманчука была аднагалосна падтрыманая сябрамі Палітрады АГП. Старшыня арганізацыі Анатоль Лябедзька пойдзе з Раманчуком у адной звязцы, а ў выпадку перамогі гэтага кандыдата зойме пасаду прэм'ер-міністра.

«У сённяшні час кандыдатам у прэзідэнты павінен вылучацца чалавек, які добра ведае эканоміку, фінансы, чалавек, за плячыма якога ёсць вялікія напрацоўкі менавіта ў галіне эканомікі. І такім чалавекам Яраслаў Раманчук. Мы вельмі адказна ставімся да гэтых выбараў, і вось менавіта гэтая адказнасць і падказала нам, што найлепшым кандыдатам можа быць Яраслаў Раманчук», — сказаў Анатоль Лябедзька.

Пасля некалькіх выступаў слова ўзяў сам Раманчук. Пачынаў гаварыць па-беларуску і выбачаўся за тое, што праграма напісаная па-расійску. «На жаль, расійская мова дамінуе ў нашым грамадстве. Але гэта не значыць, што наша праграма будзе прарасійскай ці праеўрапейскай. Яна будзе прабеларускай», — зазначыў эканаміст.

Разам з гэтым, кандыдат не прамінуў адзначыць, што вольна валодае пяцццю мовамі.



SVABODA.ORG

**Лябедзька (справа) пойдзе з Раманчуком у адной звязцы, а ў выпадку перамогі зойме пасаду прэм'ер-міністра.**

Праграма Раманчука мае назву «Мільён працоўных месцаў для Беларусі». І складаецца яна з адных эканамічных палажэнняў.

Раманчук сцвярджае, што ён ведае, як стварыць новыя рабочыя месцы ў краіне. Найперш гэта ўдасца зрабіць за кошт індывідуальных прадпрымальнікаў, малога і сярэдняга бізнесу, а таксама замежных інвестыцый.

«Улады хочуць стварыць гэтыя працоўныя месцы зверху, шляхам разнарадак і генпланаў, а мы знізу, за кошт прыватнай ініцыятывы», — зазначыў Раманчук. Замест лядовых палацаў кандыдат прапанаваў будаваць жытло для моладзі і рабочых.

**Замест лядовых палацаў Раманчук прапануе будаваць жытло для моладзі і рабочых.**

На прэзентацыі прысутнічалі і будучыя канкурэнты (ці хаўруснікі?) Раманчука. Быў лідэр кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў, сустаршыня БХД Віталь Рымашэўскі, старшыня посткамуністычнага «Справядлівага свету» Сяргей Калякін.

Назваў Раманчук і сваю будучую каманду. У яе ўвайшлі: Станіслаў Багданкевіч (у выпадку перамогі Раманчука старшыня Нацбанка), Аляксандр Сасноў (былы міністр працы), Леў Марголін (кіраўнік штаба), Васіль Старавойтаў (рэформа ў галіне сельскай гаспадаркі), Анатоль Паўлаў (былы прарэктар БДУ зоймецца адукацыяй), Віктар Чайчыц (маскоўскі беларус, які мае досвед у дыпламатыі), Леанід Заіка (эканоміка) і многія іншыя.

«Мы толькі набіраем хуткасць. Бег будзе імклівым і пераможным», — скончыў Я.Раманчук выступ.

Запыталіся ў Раманчука пра магчымае супрацоўніцтва з кампаніяй «Гавары праўду». «Вельмі пазітыўна ацэньваю магчымасць супрацоўніцтва з гэтай арганізацыяй. Дамаўляцца з імі нам будзе можа лягчэй, чым з многімі іншымі магчымымі кандыдатамі. Я не бачу ніякіх палітычных ці ідэалагічных супярэчнасцей з кампаніяй, якую ўзначальвае Някляеў», — зазначыў Раманчук.

АГП будзе працягваць кансультацыі з іншымі кандыдатамі ад апазіцыі. «Нашы патрабаванні, каб кандыдат быў за незалежнасць краіны, за рынкавыя рэформы, а таксама свабоду недзяржаўных арганізацый і СМІ. Няма людзей, якія кажуць, што Мытны саюз — гэта добра. Горш за ўсё размаўляць і дамаўляцца з людзьмі, што не маюць уласнай пазіцыі. А мы людзі гнуткія», — гаварыў Раманчук.

«Непрымальнымі для нас ёсць людзі, якія кулуарна спрабуюць дамовіцца з уладамі. Мы на такое не пойдзем ніколі», — казаў Анатоль Лябедзька.

Таксама лідэр партыі расказаў пра выпадак, як ён з Раманчуком удзельнічаў у эфіры радыёстанцыі «Эхо Москвы» і, зірнуўшы на імя па бацьку [Часлававіч — «НН»] і прозвішча Раманчука, расійцы сказалі: «Гэта не наш чалавек».

Які будзе першы падпісаны Раманчуком загад пасля перамогі? «Гэта будзе дырэктыва аб лібералізацыі. Потым будзе неабходна правесці канстытуцыйную рэформу».

Алгарытму адстойвання перамогі Раманчук, тым не менш, не агучыў. Пра вуліцу і плошчу на прэзентацыі гучала вобмаль. Увогуле, гэта больш нагадвала эканамічны блок праграмы асноўнага кандыдата.

А ці збіраецца перад выбарамі Раманчук развітацца са статусам халасцяка? Кажа, што бліжэйшы год жаніцца не можа, бо ў студэнні ў яго памёр бацька. Тым не менш, Лябедзька супакоіў, што ў кандыдата ад АГП ёсць «вельмі прывабная маладая асоба».

**Зміцер Панкавец**

**Яраслаў Раманчук**

нарадзіўся 10 студзеня 1966 у Сапоцкіне Гродзенскага раёна. Скончыў Лінгвістычны ўніверсітэт, аспірантуру пры БДУ (кафедра эканамічных вучэнняў). Працаваў выкладчыкам, журналістам, дырэктарам прадпрыемства, аналітыкам. Быў галоўным спецыялістам камісіі па эканамічнай палітыцы і рэформах Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13–га склікання.

3 лютага 2002 года — кіраўнік Навукова–даследчага цэнтра Мізэса аналітычнага цэнтра «Стратэгія».

З красавіка 2000 года — намеснік старшыні АГП. Заслужыў сабе славу як эканаміст крайне ліберальных поглядаў.

# У Ратушы, але па-расійску

**Алесь Міхалевіч, палітык паходжаннем з БНФ, 27 мая прэзентаваў сваю перадвыбарную праграму.**

Сваю кандыдацкую праграму Алесь Міхалевіч прэзентаваў у канферэнц-зале ў Ратушы. «Мы проста прыйшлі і заключылі дамову», — патлумачыў палітык, як яму гэта ўдалося. Ратуша — сімвал самакіравання, да якога імкнецца кандыдат.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Алесь Міхалевіч**

нар. у 1975. Ён з сям'і навукоўцаў. Скончыў БДУ па спецыяльнасці паліталогія. Узначальваў Задзіночанне беларускіх студэнтаў, доўгі час уваходзіў у Партыю БНФ. Быў дэпутатам Пухавіцкага райсавета. Жанаты, мае дзвюх дачок. Старэйшая вучыцца ў беларускамоўнай гімназіі.

Алесь спадзяецца зняць самыя прэстыжныя залы і ў рэгіёнах.

Другі сюрпрыз — сваю праграму прынцыпова беларускамоўны палітык прадставіў па-расійску. Ён сказаў, што гэта знак ягонай цвярозай ацэнкі моўнай сітуацыі ў краіне. «Большую частку маіх агітматэрыялаў зробім па-расійску, бо гэтую мову большасць беларусаў лепш ведае і ўспрымае». Тым не менш, Алесь абяцае росквіт беларускай мове з абраннем яго прэзідэнтам.

### «Мая праграма антыкрызісная»

У Ратушы агучылі тэзісы праграмы. Цалкам яна з'явіцца ў верасні. «Мая праграма антыкрызісная», — адзначыў Міхалевіч. Назва яе — «Беларусь: стратэгія эвалюцыі». Праект падкрэслена акцэнтуецца на Беларусі — назва краіны гучыць у кожным падпункце раздзелаў: «Прывабная Беларусь», «Энергетычная Беларусь», «Дзелавая Беларусь», і г.д. Міхалевіч і яго паплечнікі падкрэсліваюць, што рухавіком праграмы будзе моцная эканоміка, якая выцягне на сабе ўсе астатнія сферы жыцця. У камандзе палітыка сабраліся спрэс людзі «з рэальнага жыцця». Тут два эканамісты — Алесь Лукашэвіч і Віктар Яўмененка, правізар з Бабруйска Данута Чыгір, геолаг Канстанцін Лукашоў, філосаф Ігар Драко.

### Забараніць «чарніла»

Воплескамі віталі журналісты заяву Міхалевіча аб уключэнні пункта аб забароне пладова-ягадных вінаў. Палітык вітае закон пра забарону распіцця спіртнога ў грамадскіх месцах, але пры гэтым выступае за развіваццё сферы адпачынку. Палітык не баіцца ісці на выбары з такім непапулярным абяцаннем, бо «аматары «чарніла» — не яго электарат».

### «Не бачу сэнсу ў вылучэнні адзінага»

Міхалевіч не бачыць сэнсу ў выбарах адзінага зараз. «Вызначацца з адзіным трэба было гады тры таму», — заявіў палітык. Згадаўшы канкурэнтаў, дадаў, што ў любым выпадку лічыць сваю праграму найбольш рэалістычнай і выканальнай.

### «Калі няма скрадзенай перамогі, змагацца няма за што»

Палітык кажа, што колькасць зняверaных ва ўладзе людзей расце штогод, але пры гэтым не расце колькасць прыхільнікаў дэмакратаў. «Наша задача, каб было больш тых, хто за нас. Калі будзе больш паловы такіх грамадзянаў, мы пераможам і наш прыход да ўлады будзе выключна тэхнічнай працэдурай. Калі няма скрадзенай перамогі, змагацца няма за што».

Нагадаем, што Міхалевіч першым з палітыкаў абвясціў, што кідае выклік Лукашэнку. Пачатак кампаніі кандыдата стартаваў 27 студзеня ў планетарыі ў парку Горкага.

**Сямён Печанко**

# Зялёныя ідуць у прэзідэнты самастойна

**Але перамовы з Аляксандрам Мілінкевічам працягваюць.**

Беларуская партыя «Зялёныя» прадставіла свайго кандыдата ў прэзідэнты — першага намесніка старшыні партыі Юрыя Глушакова. На мінулых выбарах «зялёныя» былі першымі, хто вылучыў кандыдатуру Аляксандра Мілінкевіча, які і стаў урэшце адзіным кандыдатам ад апазіцыі. Сёлета яны ідуць на выбары самастойна, але не выключаюць супрацы з іншымі сіламі. У прыватнасці, было адзначана, што з лідэрам Руху «За Свабоду» вядуцца перамовы.

**СП**



СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Юры Глушакоў**

нарадзіўся ў Гомелі ў 1966. Скончыў БДУ. Працаваў навуковым супрацоўнікам Гомельскага абласнога краязнаўчага музея, выкладчыкам Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, быў дэпутатам Гомельскага гарсавета. Удавец, выхоўвае дачку.

## І генерал таксама...

Былы дэпутат палаты прадстаўнікоў генерал Валеры Фралоў мае намер паўдзельнічаць у прэзідэнцкай кампаніі. «Я абдумваю такую магчымасць. Аднак імавернасць таго, што я буду вылучацца, вялікая. У бліжэйшыя дні ўсё стане вядома. Ёсць шмат людзей, якія настойваюць на маім вылучэнні, — моладзь, афганцы. Я гатовы размаўляць з усімі, хто будзе гатовы рэальна працаваць. Зараз мне найбольш вартым з тых, хто ўжо вылучыўся, бачыцца Андрэй Саннікаў».

У 2006 годзе вылучэнне Фралова на пасаду прэзідэнта скончылася правальна.

**Алесь Пілецкі**

## Самы радыкальны кандыдат

З'езд Партыі БНФ вылучыў у прэзідэнты Рыгора Кастусёва. Ён намеснік старшыні партыі.

Старое кіраўніцтва БНФ, у прыватнасці Барщэўскі і Вячорка, з'езд праігнаравалі. Кастусёў мае самую радыкальную праграму сярод усіх прэтэндэнтаў: абарона нацыянальных каштоўнасцяў і ўступленне Беларусі ў НАТО.

Варта адзначыць, што частка партыі лічыць неабходным падтрымаць на выбарах лідэра Руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча як наймацнейшага правацэнтрысцкага кандыдата.

**Кастусь Матушыч**

# Саскочылі ў апошні момант

Расія і Казахстан падпісалі Мытны кодэкс без Беларусі.

Прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі не паляцеў у Пецярбург на падпісанне Мытнага кодэкса. У выніку 28 мая прэм’ер-міністры Расіі і Казахстана Уладзімір Пуцін і Карым Масімаў падпісалі дакументы аб стварэнні адзінай мытнай прасторы. Без Беларусі.

### Неабавязковы Сідорскі

Калі верыць расійскім чыноўнікам, за тыдзень, які прайшоў з папярэдняй трохбаковай сустрэчы, «бакам удалося дамовіцца амаль пра ўсе спрэчныя моманты». Што наконт гэтага думалі беларускія чыноўнікі, заставалася невядомым. Вядома было затое, што нявырашаным заставалася пытанне наконт нафтавых мытаў для Беларусі.

Наша краіна катэгарычна заявіла, што без іх зніжэння ці, пажадана, поўнай адмены, далейшыя перамовы бессэнсоўныя. Расія ж даводзіла, што мытны кодэкс і нафтавыя мыты ніяк між сабой не звязаныя, а час для дадатковых дамоўленасцяў прыйдзе пазней, перад стварэннем Адзінай эканамічнай прасторы. А пакуль што, маўляў, радуйцеся таму, што мы дазваляем вам захаваць мытную палёгку пры ўвозе аўтамабіляў фізічнымі асобамі.

Аўтамыты — гэта галоўная саступка, якую ўдалося выгандляваць беларусам. Паводле інфармацыі расійскага «Камерсанта», даведаўшыся пра паспяховае вырашэнне аўтамабільнага пытання, Сяргей Сідорскі запэўніў Расію і Казахстан, што прыедзе на сустрэчу, але ў апошні момант усё ж саскочыў. Афіцыйнае тлумачэнне распаўсюдзіла прэс-служба прэм’ера: «Сустрэча не была дастаткова падрыхтаваная».

Спрабуючы зрабіць добрую міну пры дрэнной гульні, Уладзімір Пуцін зазначыў, што ў выпадку чаго саюз можа функцыянаваць і ў двухбаковым рэжыме. «Як толькі Беларусь у сябе ўнутрыправавыя працэдуры закончыць узгадняць, спадзяюся, у гэты ж момант дакументы падпіша, і мы будзем рухацца ў трохбаковым фармаце. Калі не адбудзецца далучэнне, будзем рухацца ўдвух», — заявіў кіраўнік расійскага ўрада.



АНТОН МАТОЛЬКА

Эканамічныя рашэнні прымае Лукашэнка, але адказнасць за іх нясе Сідорскі.

Пуцін таксама заявіў, што, калі Мінск не далучыцца да дамоваў Мытнага саюза, Расія і Казахстан будуць уваходзіць у СГА ўдваіх.

### Аўто без даверанасцяў

Як менавіта збіраюцца рухацца Расія з Казахстанам, пакуль незразумела. Поўны спіс падпісаных дакументаў не быў абвешчаны, а камісія Мытнага саюза адмовілася ад любых каментароў па выніках сустрэчы. Невядома, як вырашыліся спрэчныя пытанні наконт мытаў у авіяпрамысловасці і рэжыму гандлю з іншымі краінамі.

Са слоў прэм’ераў стала зразумела, што да 2012 года захоўваецца льготны рэжым увозу патрыманых аўто. Праўда, машыны нельга будзе прадаць на тэрыторыі Расіі і купляць па даверанасці. Відаць, тое ж будзе чакаць і Беларусь у выпадку ўступлення ў саюз. Мытны кантроль на мяжы Расіі і Казахстана ўсё роўна захаваецца.

### Яшчэ не позна адмовіцца

Дэкларуючы ўяўную гатоўнасць да працягу перамоваў, беларускі бок прытрымліваецца катэгарычных поглядаў — калі не будзе таннай нафты, Беларусі ў саюзе не будзе. Фармальна мы не адмаўляемся, але фактычна і не згаджаемся. Трымацца ў падвешаным стане можна хоць месяц, хоць год, але рана ці позна ўзнікне канкрэтнае пытанне, ці трэба Беларусі той Мытны саюз? Пакуль што ніхто з чыноўнікаў не бярэ на сабе адказнасць адкрыта паставіць яго — чакаюць дазволу зверху.

Еўразійскі Мытны саюз быў бы непераадольнай перашкодай для інтэграцыі Беларусі з Еўрасаюзам. Краіна мела б адкрытую мяжу з прасторай аж да Кітая. Яна стала б неад’емнай часткай расійскага эканамічнага механізма.

**Яўген Васількоў**

# «Стоп-бензін. Мы не дойныя каровы!»

Аўтамабілісты заклікаюць не запраўляцца 4 чэрвеня ў знак пратэсту.



Другое за апошнія гады яднанне аўтамабілістаў — пасля гісторыі з жывым шчытом — выклікана падаражаннем бензіну. З пачатку года ён стаў даражэйшым на 15%. Без бачных на тое прычын, удакладняюць каардынатары акцыі.

«6 мільёнаў тон бязмытнай нафты для ўнутранага ўжытку, якія краіна атрымлівае ад Расіі, павінны прадавацца аўтамабілістам па нізкіх цэнах, амаль яква ўсходніх суседзяў», — заяўляе адзін з актывістаў кампаніі Канстанцін Міхайлаў.

Ініцыятыва стварылася спантанна ў інтэрнэце і не мае выразнага цэнтра кіравання. Кожны ахвотны можа прычапіць сабе на машыну тэматычны магнічык (глядзі фота) ці павесіць на шкло адпаведны інфармацыйны аркуш. «Наклейкі на машыны забароненыя, а пра магніты ў правілах дарожнага руху нічога не сказана», — удакладаняюць каардынатары. Некаторыя СТА сталі прапаноўваць зніжкі ўдзельнікам акцыі. Паслугі каштуюць на 5—10% танней.

Сэнс акцыі заключаецца ў тым, каб ад 1 да 4 чэрвеня па магчымасці адмовіцца ад наведвання заправак «Белнафтахіма», «Мінскаўтазапраўкі», «Беларуснафты» і «Аргнафтахіма». Калі ж паліва ў аўтамабілі амаль на нулі, запраўляцца трэба не больш чым на 1—2 літры. Нарэшце, кульмінацыяй акцыі стане 4 чэрвеня — дзень поўнай адмовы ад карыстання аўтамабілямі.

Раней такія акцыі — адмовы ад машын — праводзіліся па прапанове сусветных экалагічных арганізацый, але вялікай папулярнасці ў Беларусі не здабылі. Цяперашняя выклікана іншымі прычынамі — клопатам не пра прыроду, а ўласныя грошы.

На дзесяць мільёнаў жыхароў Беларусі зарэгістравана 2,5 мільёна аўтамабіляў. Атрымліваецца, кожная другая сям’я мае ўласнае прыватнае аўто. Калі ўлічыць яшчэ і членаў іх сем’яў, выходзіць крытычная маса.

**ЯВ**

# Глыбокае чакае інвестыцыі

У Глыбокім 30 траўня прэзентавалі інвестыцыйны атлас раёна, падрыхтаваны інфармацыйна–кансалтынгавай установай «Беларда».

Выданне расказвае пра гісторыю і сучаснасць Глыбоцкага раёна, а таксама ўтрымлівае карысную інфармацыю для патэнцыйных інвестараў.

«Інвестыцыйны атлас — гэта інструмент для ўнутранага і знешняга карыстання, — тлумачыць Алесь Мазур, адказны за выпуск. — Ён адразу не вырашыць фінансавых праблемаў Глыбоччыны, але гэта добры інфармацыйны дакумент пра тое, што можна развіць у дадзеным рэгіёне і што можа прынесці грошы ў мясцовую эканоміку».

З тым, што атлас змястоўны і цікавы, пагадзілася нават галоўная спецыялістка ідэалагічнага аддзела райвыканкама Галіна Грамакоўская.

На прэзентацыі прысутнічаў Алесь Міхалевіч, які збіраецца балатавацца на прэзідэнцкіх выбарах: «На мой погляд, патрэбна развіваць брэнд Глыбокага на тэрыторыі Беларусі, — мяркуе ён. — У Беларусі рэгён вядомы, дзякуючы сваёй малочнай прадукцыі. Вельмі важнай прамоцыяй пазітыўнага іміджу Глыбокага можа таксама стаць турызм. Памятаючы добры адпачынак і ведаючы добрую экалагічную сітуацыю тут, мінчукі могуць выбраць менавіта глыбоцкую прадукцыю. Тут у першую чаргу патрэбна працаваць над папулярызацыяй брэнда Глыбокага, гэта добрая падстава для супрацы грамадскага сектара, дзяржаўнага сектара і бізнес-структураў».

Дарэчы, менавіта ў Глыбокім прапаноўваў набудаваць гатэляў і казіно былы дэпутат Васіль Хрол.

**Настасся Шамрэй**

## Сцісла

• **Польскія джынсы будуць шыць у Беларусі.** Фабрыка па выпуску джынсавай вопраткі праз год адкрыецца ў Гродне. Заснавальнікі прадпрыемства з замежным капіталам «БелРадэр» — польская фірма «Радэр» з Кракава і брытанская кампанія з Уэльса, якія прафінансуюць праект. Кошт праекта — больш за 2 млн еўра. Фабрыка ў Гродне будзе дакладнай копіяй той, якая размешчана ў прыгарадзе Кракава.

• **Аквапарк пад бокам у Лукашэнкі.** У жніўні гэтага года пачнецца будаўніцтва мінскага аквапарка. Ён будзе знаходзіцца каля Драздоўскага водасховішча, непадалёку ад рэзідэнцыі кіраўніка дзяржавы. Плошча аквапарка складзе 20 тысяч квадратных метраў. Будаўніцтва павінна скончыцца ў 2012 годзе.

• **Замест другой МКАД — Мінская аб’язная.** Аўтатраса, якую пабудуюць у аб'езд Мінска, не будзе называцца другой кальцавой. Мяркуецца, што ёй дадуць назву Мінская аб'язная аўтадарога. Пра гэта паведаміў старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Віктар Нікіцін падчас прэс-канферэнцыі па пытаннях карэктыроўкі генеральнага плана развіцця Мінска. Траса будзе пабудаваная ў 2013—2015 гадах. Пакуль няясна, дзе яна праляжа.

• **Расія пераймае кантроль над фармацэўтычным рынкам Беларусі.** Расійская кампанія «Катрэн» стала саўладальнікам беларускага фармдыстрыб’ютара «Дамінантафарм», выкупіўшы 51% акцый. Дамова ацэньваецца ў $30 млн. Абарот «Дамінантафарма» ў 2009 годзе склаў $47 млн.

• **Пад Мінскам пабудуюць вёску крамаў.** Сродкі ў гэты праект укладвае «Белсвісбанк». Вёска будзе складацца з дзвюх частак. Першая — сетка маленькіх крамак і буцікаў, у другой будзе размешчаны гатэль і вялікі гандлёвы аб’ект кшталту гіпермаркета. Вёска крамаў будзе размешчана за 23 кіламетры ад МКАД.

• **«Беларусбанк» гатовы прадаць частку сваіх акцый.** Але кантрольны пакет усё роўна застанецца ў дзяржавы. У адрозненне ад сітуацыі з «Белінвестбанкам», галоўны банк прапануе замежным пакупнікам мінарытарны пакет.

**ЯВ**

# ДФР завёў справу на распаўсюдніка беларускамоўнай прадукцыі

У поле зроку фінансавай міліцыі трапілі «Кнігі — поштай».

На мінулым тыдні ў сеціве з'явілася інфармацыя пра тое, што следчыя Дэпартамента фінансавых расследаванняў выклікаюць на гутаркі кліентаў сэрвісу «Кнігі — поштай» (knihi.net). Людзей пытаюць, з якой мэтай яны пераказвалі грошы распаўсюдніку кніг Яўдаху Аляксандру Анатолевічу. Пры гэтым следчыя дэманструюць спісы кліентаў з падрабязнымі звесткамі пра іх: пашпартныя звесткі, хатні адрас.

Алесь Яўдаха пра дзеянні супрацоўнікаў ДФР даведаўся ад журналістаў. Ён расказаў, што ў лютым гэтага года ў яго замовілі некалькі дзясяткаў асобнікаў кнігі «Маладафронтаўцы». «Гэта быў кантрольны закуп. Зладзілі яго супрацоўнікі аддзела рэйдавых праверак Міністэрства па падатках і зборах Кастрычніцкага раёна сталіцы», — кажа А. Яўдаха. Па яго словах, яму прапанавалі праехаць у аддзяленне, дзе паказалі спіс людзей, якія дасылалі яму паштовыя пераказы. Не дачакаўшыся ад яго тлумачэнняў, распаўсюдніка адпусцілі, не склаўшы ніякіх пратаколаў.

Алесь выказвае здагадку, што праверка можа мець палітычнае адценне. Магчыма, кантралёраў зацікавіла акурат кніга «Маладафронтаўцы». Інфармацыя пра тое, што яе можна замовіць праз «Кнігі — поштай», была змешчаная на сайце «Маладога фронту» mfront.net, кажа ён.

Яўдаха падкрэслівае, што палітычнай дзейнасцю ніколі не займаўся. Ён не лічыць свой занятак і бізнесам: «Гэта была справа для душы. Я даваў людзям магчымасць набыць сучасную беларускамоўную літаратуру і музыку праз пошту. Найперш гэта людзі з рэгіёнаў».

Замоўленую на інтэрнэт-сайце «Кнігі — поштай» прадукцыю кліенты аплачвалі праз пошту накладзеным плацяжом. Тут можна было замовіць творы айчыннай і замежнай літаратуры, навуковую літаратуру і публіцыстыку, выданні для дзяцей, айчынную музыку на роднай мове, беларускамоўныя фільмы і перакладзеныя на беларускую мову замежныя стужкі.

Музыка Лявон Вольскі, чые дыскі слухачы знаходзілі ў тым ліку і дзякуючы «Кнігам — поштай», мяркуе, што ўжо сам па сабе распаўсюд беларускамоўнай прадукцыі ў сучаснай Беларусі — занятак рызыкоўны. «І навошта гэта ўладам?» — не разумее музыка.

Філосаф Валянцін Акудовіч кажа, што, дзякуючы knihi.net, ягоныя кнігі прадаваліся па ўсёй Беларусі, а не толькі ў лічаных кнігарнях Мінска. «Я не бяруся ацэньваць дзейнасць гэтай інтэрнэт-крамы з эканамічнага боку. Але як культурная з'ява гэты праект проста неацэнны», — кажа філосаф. Беларускамоўнай літаратуры, па яго словах, цяжка прабіцца на рынак. У дзяржаўных кнігарнях кнігі пабеларуску часта цяжка адшукаць. У такіх умовах інтэрнэт-крамы кшталту «Кнігі — поштай» з'яўляюцца паратункам для выдаўцоў і аўтараў беларускамоўнай друкаванай прадукцыі.

**Сямён Печанко**

# Футбол па-чорнаму



Леапард Закумі — талісман сёлетняга чэмпіянату.



Іваарыец Дзідзье Драгба (справа) хоча паказаць сваю найлепшую гульню на родным кантыненце.

Працяг са старонкі 1.

У чвэрцьфінале карэйцы сустракаліся з партугальцамі і ўжо на 24-й хвіліне выйгравалі з лікам 3:0. Але геніяльны Эйсебіё змог пераламаць ход той сустрэчы.

Той пройгрыш жахліва раззлаваў карэйскага дыктатара Кір Ір Сена. Амаль у поўным складзе зборная была адпраўленая ў канцлагеры. Тым не менш, гэта быў першы поспех азіяцкага футбола.

Інтрыга першынства ў тым, як зможа падрыхтаваць аргенцінцаў да матчаў адзін з найвялікшых футбалістаў XX стагоддзя Дыега Марадона. У ягоным распараджэнні — найлепшы футбаліст сучаснасці Ліянэль Месі. Ці змогуць дзве зоркі ўжыцца разам?

Чэмпіёны Еўропы з Іспаніі ніколі не выйгравалі сусветнае першынство. Ім хочацца зламаць такую сумную традыцыю. Англічане, немцы, італьянцы, бразільцы таксама настройваюцца на перамогу.

Беларусаў у Афрыцы не будзе. Тут няма нічога нечаканага. Не будзе на першынстве таксама і бліжэйшых суседзяў — Расіі, Украіны, Польшчы. Самая блізкая да нас краіна, якая паедзе ў ПАР, — Славаччына.

Цікава, што напярэдадні мундыялю гадаванцы Штанге сыгралі дзве гульні ў Аўстрыі з камандамі-ўдзельніцамі чэмпіянату. З Гандурасам разышліся мірам — 2:2, а вось у Паўднёвай Карэі выйгралі — 1:0. Такіх вынікаў магло б хапіць для выхаду з групы.

У любым выпадку, нават без беларусаў, нас чакае месяц якаснага футбола з афрыканскім каларытам.

**Зміцер Панкавец**



Гасцей мундыялю чакае ў ПАР гарачая сустрэча. На фота: удзельніца групы падтрымкі зборнай Паўднёвай Афрыкі.

# «Мужчынская гульня, а не балет»

За каго на чэмпіянаце свету будуць перажываць беларусы? Апытанне «НН».

**Сяргей Крывец, футбаліст зборнай Беларусі:** «Італія. Увогуле буду за прыгожы футбол. А іншыя сімпатыі ўзнікнуць цягам чэмпіянату».

**Віталь Сіліцкі, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў:** «1. ЗША. Краіна, дзе я пражыў шэсць гадоў і адбыўся як прафесіянал. 2. Славакія. Проста там у мяне шмат сяброў і іх мова вельмі падобная да нашай».

**Альгерд Бахарэвіч, літаратар, жыве ў Гамбургу:** «Deutschland, Deutschland über alles. І, мяркую, нашы выйграюць гэты чэмпіянат. А яшчэ за Славенію, бо даўно сімпатызую гэтай краіне. І за КНДР — яна мае шанец «адпомсціць» партугальцам за 1966 год».

**Лявон Баршчэўскі, перакладчык:** «З дзяцінства хварэю за Германію. На гэты раз таксама буду за іх».

**Павел Севярынец, сустаршыня БХД:** «За англічан. Прыгожа гуляюць. Падабаецца іхняя воля да перамогі. Б'юцца да апошняга. Іх футбол адпавядае майму характару, напэўна».

**Багдан Арлоў, заўзятар, аўтар беларуска-расійскага слоўніка спартовых тэрмінаў:** «За Іспанію. Я па адукацыі іспаніст. Крыху крыўдна, што такая прыстойная зборная не можа выйграць мундыяль. Злыя языкі нават называлі іспанскую зборную «футбольнымі імпатэнтамі». Мінулы чэмпіянат Еўропы гэта абверг, буду чакаць працягу. Таксама буду заўзець за ўсіх аўтсайдэраў, за сенсацыі».

**Андрэй Хадановіч, паэт:** «За харошы футбол. А так сімпатызую Англіі і Аргенціне».

**Зміцер Бусел, праграміст:** «За Англію. Мне падабаецца англійская прэм'ер-ліга, увогуле англійскі футбол. Да таго ж, даўненька яны ўжо не выйгравалі чэмпіянат свету. Буду таксама перажываць за Аргенціну, за Марадону».

**Аляксей Янукевіч, старшыня Партыі БНФ:** «За англічан. Гэтая краіна родапачынальніца футбола, людзі там проста жывуць футболам. Англічанам даўно не шанцуе на чэмпіянатах свету, і мне хочацца, каб ім нарэшце пашанцавала».

**Іван Шыла, палітык з Салігорска:** «За англічан. Увесь час хварэю за зборную Англіі, за «Манчэстэр Юнайтэд». Мне крыўдна, што гэтая зборная даўно нічога не выйгравала».

**Аляксандр Старыкевіч, журналіст:** «Адной такой каманды не будзе. Калі б былі беларусы, то гэта адна справа. Тады цябе проста падкідвае ўверх у парыве заўзятарскай жарсці. Тут жа буду глядзець футбол спакойна. Можа, хацелася б, каб Англія нешта выйграла. Але калі і не выйграе, то нічога страшнага».

**Алег Іваноўскі, рэдактар часопіса kiwi.mag:** «Буду хварэць за зборную Германіі. Мне падабаецца іх упарты стыль, на мяжы грубіянства. У выкананні немцаў футбол больш падобны да сапраўднай мужчынскай гульні, а не да балета. Не памятаю такіх матчаў, калі б яны змірыліся, апусцілі рукі. Даволі сімпатычна выглядае Аргенціна, хацелася б, каб Марадона дадаў да сваіх тытулаў нешта істотнае з гэтага чэмпіянату. Пры такім нелагічным, але моцным падборы гульцоў».

**Апытаў Зміцер Панкавец**

# Рыбак зачапіў вудай высакавольтную ЛЭП

Мужчына застаўся жывым. На ім абгарэла вопратка і скура. На месцы здарэння забіла каля сотні рыбін.

Рыбалка ў сталічным мікрараёне Вяснянка для 55-гадовага Валерыя П. ледзь не скончылася трагедыяй. 28 мая ўвечары мужчына рыбачыў на адрэзку Свіслачы між футбольным манежам і паркам «Дрымлэнд». Закідаючы вуду, ён зачапіў высакавольтную лінію электраперадач. Два разы гучна ляснула. Сведкам здарэння апынуўся чытач «НН» Яраслаў.

Па яго словах, на мужчыну ад кантакту з ЛЭП імгненна згарэла ўся вопратка, абгарэла скура і валасы. Пластыкавая вуда аплавілася. На месцы, дзе сядзеў рыбак, выгарала трава, а пры беразе, куды мужчына закідаў вуду, пачала ўсплываць рыба, забітая токам.

Рыбак не страціў прытомнасці, аднак у стане шоку ўвесь час прасіў медыкаў «хуткай» адпусціць яго дамоў, каб апрануцца. Цяпер мужчына ў цяжкім стане знаходзіцца ў бальніцы.

**ЯС, СП**



Гэта вуда Валерыя пасля кантакту з ЛЭП.



Ад вопраткі небаракі мала што засталося.




Сябар рыбака.

## Гучны арышт у Мінгарвыканкаме

Пад варту ўзяты начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мікалай Ком.




Пра таямнічы арышт высокапастаўленага чыноўніка стала вядома 25 мая. Міністэрства ўнутраных спраў суха пракаментавала сітуацыю з Мікалаем Комам: «Галоўным следчым упраўленнем папярэдняга расследавання МУС Беларусі 25 мая прад'яўлена абвінавачванне ў неаднаразовым атрыманні хабараў, перавышэнні службовых паўнамоцтваў, а таксама ў здзяйсненні іншых злачынстваў».

Чыноўнік узяты пад варту, і з таго часу ніякіх навінаў пра развіццё падзей не паступала.

М.Ком вылучаўся сярод іншых чыноўнікоў рэдкай ініцыятыўнасцю. Менавіта ён быў фактычным ідэолагам рашэння №101 аб ільготных крэдытах на будаўніцтва ў Мінску. Рашэнне было надзвычай выгаднае для забудоўшчыкаў, якім пагражала замарожванне будаўніцтва дамоў праз недахоп прыцягнутых сродкаў ад грамадзян. Не засталіся ў крыўдзе і мінчане — ахвотныя маглі пралезці ў спіс на льготны крэдыт, не чакаючы ў чарзе дваццаць гадоў.

Выключна станоўча адклікаюцца пра чыноўніка і на юрфаку БДУ, дзе ён выкладаў жыллёвае права.

У Мінгарвыканкаме навіну не каментуюць, але зазначаюць, што істотнай змены курса жыллёвага будаўніцтва чакаць няварта.

Гэты арышт стаў не першым у Мінгарвыканкаме за апошні час. Найбольшы розгалас атрымала справа былога старшыні Кастрычніцкага раёна Міхаіла Цыгана. Яму таксама інкрымінавалі хабар і перавышэнне паўнамоцтваў, але ў спісе «дасягненняў» фігуравалі яшчэ крадзеж і агнястрэльная зброя.

**ЯВ**

## Сцісла

• **У Лунінецкім раёне павесілася 24-гадовая жанчына.** У хляве яе знайшоў грамадзянскі муж. Паводле яго слоў, у гэты дзень загінулая гаварыла яму, што не хоча жыць. Жанчына знаходзілася ў адпачынку па доглядзе двухгадовага дзіцяці. Усяго ў сям'і выхоўваецца двое дзяцей.

• **Суд над Шульманам спынілі.** Былы дырэктар прадзюсерскага цэнтра «Клас Клуб ДК» Генадзь Шульман дагэтуль чакае прысуду. Чалавек, які пазычыў больш за 600 мільёнаў рублёў, быў затрыманы 6 кастрычніка 2009 года. Шульман настойвае, што грошы вяртаць ён меў намер, але чакаў, пакуль патрэбная сума назбіраецца ў якасці прыбытку ад канцэртаў. Калі будзе прызначана чарговае судовае пасяджэнне па справе Генадзя Шульмана, пакуль няясна. Слуханні прыпынілі на час для дадатковага разгляду справы.

• **Дзяцюк жорстка згвалтаваў дзяўчыну на могілках.** Спачатку гвалтаўнік, 30-гадовы жыхар Жлобіна, і яго будучая ахвяра, 20-гадовая дзяўчына, разам пілі на могілках. Пасля ён яе жорстка згвалтаваў і пакалечыў, вырваўшы часткі ўнутраных органаў. Дзяўчына ляжала ў рэанімацыі, цяпер пагрозы яе жыццю няма. Мужчына ўжо адбываў пакаранне за такое злачынства, учыненае ў дачыненні да сваёй былой жонкі. У 2004 годзе ён быў асуджаны, але выйшаў з турмы па амністыі.

• **Дзяўчынка звалілася між вагонаў метро.** Гэта было на станцыі «Няміга». 10-гадовая школьніца бегла на цягнік, насустрач ёй бег малады хлопец. Яны сутыкнуліся, і дзяўчынка ўпала проста на рэйкі, трапіўшы між вагонаў. Яе выратавалі пасажыры, якія прыцягнулі ўвагу машыніста і дапамаглі дзяўчынцы выбрацца з пасткі.

• **У Петрыкаўскім раёне 4-гадовую дзяўчынку забіла бервяном.** Дзяўчынка гуляла ў двары свайго дома, у вёсцы Капаткевічы Петрыкаўскага раёна, і яе прываліла бярвеннем. На шляху ў бальніцу дзіця памерла. Пракуратура праводзіць праверку па факце гібелі.

• **У Наваградку зламыснікі аблілі фарбай міліцэйскія машыны.** Пацярпелі асабістыя аўтамабілі двух мясцовых участковых. Машыны былі прыпаркаваныя на неахоўных стаянках у розных раёнах горада. Фарбу ўдалося адмыць.

• **Настаўніца з Пінска гандлявала золатам.** Супрацоўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Пінскага ГАУС у мясцовай жыхаркі, якая працуе настаўніцай у школе, канфіскавалі больш за 160 залатых ювелірных вырабаў без прабірнага кляйма Рэспублікі Беларусь вагой амаль 0,5 кг на агульную суму больш за 70 млн рублёў. У настаўніцы канфіскаваны таксама нататнік з тэлефонамі пастаянных кліентаў і разліковымі запісамі.

• **Скраў барсетку, згубіў тэлефон.** Закаханыя пакінулі без увагі на лаўцы ў Севастопальскім парку Мінска барсетку. Выпадковы прахожы (раней судзімы за крадзяжы) скарыстаўся гэтым, украў чужую рэч і ўцёк. Супрацоўнікі міліцыі, якія прыбылі на месца здарэння, знайшлі ў кустах недалёка ад лаўкі згубленыя злодзеем мабільны тэлефон і пачак цыгарэт. І якое было іх здзіўленне, калі назаўтра злачынца сам з'явіўся ў дзяжурную часць. Праўда, не з пакаяннем, а... з заявай пра крадзеж мабільнага тэлефона. Барсетку вярнулі гаспадару з усім начыннем, а ў дачыненні да затрыманага распачатая крымінальная справа.

**СМ; «Народная воля», БелаПАН, Tut.by, «Еўрарадыё»**

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

## Фонд «Шанс» просіць дапамагчы 14-гадовай Юлі Мурашцы ў вылячэнні цяжкага захворвання печані

Міжнародны дабрачынны фонд дапамогі дзецям «Шанец» просіць дапамагчы 14-гадовай Юлі Мурашцы ў вылячэнні цяжкага захворвання печані, паведаміла спецыяліст фонду па сувязях з грамадскасцю Таццяна Жахоўская.

Паводле яе слоў, Юліна хвароба асабліва не праяўляе сябе вонкава — няма болі, фізічных дэфектаў, затое ўнутры асталяваўся пастаянны страх, выкліканы небяспекай жыць, як усе. Небяспечна есці шакалад і хваляваца, небяспечна своечасова не выпіць лекі і забыцца на тое, што ў цябе хвароба. Захворванне дыктуе Юлі свае ўмовы: дзяўчынка ўжо прызвычаілася абыходзіць бокам кандытарскія і праводзіць час у бясконцых чэргах у паліклініцы. Каварны вірус, які пасяліўся з-за невядомых прычын у Юліным целе, умела маскуецца, то заціхаючы на час, то абвастраючы хваробу.

Юля хварэе з двух гадоў.

Па характары яна сарамлівая і сціплая. Усё больш побач з бабуляй — Вольгай Паўлаўнай. Яе радуюць унуччыны поспехі ў вучобе. Дзяўчынка — найлепшая вучаніца ў класе, прычым ёй асабліва лёгка даюцца хімія, фізіка і матэматыка. Юля ўдзельнічае ў вучнёўскіх алімпіядах рознага ўзроўню. Аднак хвароба сур'ёзна адцягвае ад вучобы: пропускі ў школе часам доўжацца па месяцы.



Дзякуючы падтрымцы дабрачынцаў, летась фонд «Шанец» аказаў дапамогу сям'і дзяўчынкі на 24 млн рублёў. Зусім нядаўна дактары абнадзеілі Юлю: станоўчая дынаміка ў лячэнні ёсць. Аднак арганізм дзіцяці пачаў прывыкаць да прызначанага прэпарата, і ступень яго ўздзеяння знізілася. Кансіліумам дактароў інфекцыйнай бальніцы вырашана замяніць прэпарат на больш эфектыўны. На жаль, лекавы сродак «Пегасіс» не ўваходзіць у пералік бясплатных прэпаратаў, што прадастаўляюцца Міністэрствам аховы здароўя для лячэння гэтага захворвання. Юлі неабходна прайсці шасцімесячны курс тэрапіі «Пегасісам».

Цана адной ін'екцыі — 830 тыс. рублёў, а агульны кошт лячэння — 15 млн рублёў.

Фонд «Шанс» просіць дапамагчы Юліі Мурашцы.

Дабрачынны рахунак: № 3135000000100 у ААТ «Белгазпрамбанк», г. Мінск, код 742. Атрымальнік: Фонд «Шанс»; УНП 805001111. Прызначэнне плацяжу: «Ахвяраванне на лячэнне Мурашкі Юліі».

Электронны кашалёк WebMoney у беларускіх рублях: B199756836033. Прызначэнне плацяжу: «Ахвяраванне на лячэнне дзіцяці Мурашкі Юліі».

Пералічыць сродкі на дабрачынны рахунак фонду можна таксама праз плацежную сістэму EasyPay, выкарыстаўшы аўтаматычную форму аплаты на сайце фонду «Шанс» www.chance.by. Дакументы і дадатковая інфармацыя аб Юліі знаходзяцца на сайце chance.by. Акрамя таго, можна скарыстацца тэлефонамі: 8(017) 216-93-32, 8(044) 711-11-17.

**БелаПАН**

# Сквер на Людажэрскай і помнік Чыкацілу

**Вяртанне старое тапанімікі і дэмантаж савецкіх помнікаў — гэта справа нацыянальнага гонару. Піша Алесь Чайчыц.**

Мінскія ўлады абмяркоўваюць магчымае вяртанне гістарычных назваў шэрагу вуліц, а таксама перайменаванне станцыі метро «Плошча Леніна».

З былых рэспублік СССР дэсаветызацыя гарадскога ландшафту абмінула хіба Беларусь. У пачатку 1990-х людзі паспелі толькі перайменаваць вуліцы Маладзечна і вярнуць пару назваў на мапу Мінска.

Для Беларусі вяртанне старое тапанімікі — справа нацыянальнага адраджэння, справа ўласнага нацыянальнага гонару.

Месцы павінны ў першую чаргу насіць свае старадаўнія імёны: Ваньковічаў Лес, а не Парк Чалюскінцаў; Койданава, а не Дзяржынск; вуліца Падгорная, а не Маркса.

У горадзе з тысячагадовай гісторыяй цэнтральныя вуліцы не могуць называцца ў гонар камуністычнага інтэрнацыянала.

Трэба дадаць, што гістарычныя назвы павінны мець безумоўны прыярытэт над назвамі ў гонар тых ці іншых выбітных людзей. Якім бы вялікім пісьменнікам ні быў Васіль Быкаў, вуліца Ульянаўская павінна мець сваю гістарычную назву — Ільлінская.

Вызваленне ад савецкіх атрыбутаў у тапаніміцы і помніках — гэта не толькі аднаўленне гістарычнай справядлівасці, гэта таксама акт сімвалічнага ачышчэння. Без гэтага не будзе прышчэпкі ад таталітарызму на эстэтычным




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

узроўні.

Калі чалавек жыве на вуліцы Дзяржынскага, Дзяржынскі перастае ўспрымацца ім як савецкі дзеяч, але наадварот робіцца проста мілым сэрцу спалучэннем літараў. «Ах, наш любімы сквер па вуліцы Людаедскай, дзе з пацанамі пілі піва». «Ах, ты помніш наша першае спатканне ля помніка Чыкацілу».

На самой справе вуліцы Леніна і Суворава — гэта нібы чорная негатыўная аўра Беларусі.

З савецкіх помнікаў і назваў маюць права застацца толькі тыя, што звязаныя з перамогаю над нацызмам у Другой сусветнай вайне.

Час працуе на справядлівасць: для новага пакалення савецкія назвы не маюць ніякага ідэйнага зместу. Гэта выдатна, што сярод мінскай адміністрацыі людзі праявілі ініцыятыву па перайменаванні.

# Адкрыты ліст Станіслава Шушкевіча

Газета «Народная воля» апублікавала адкрыты ліст члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук, доктара фізіка-матэматычных навук і былога кіраўніка дзяржавы Станіслава Шушкевіча да прэм'ер-міністра Беларусі Сідорскага, старшыні савета рэспублікі Рубінава, старшыні палаты прадстаўнікоў Андрэйчанкі, кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Макея, старшыні Вышэйшага Гаспадарчага суда Беларусі Камянкова з патрабаваннем аднавіць справядлівасць.

«9 верасня 1997 быў падпісаны дэкрэт №16 аб «упарадкаванні пенсіяў за асаблівыя заслугі перад беларускім народам». Паводле якога, высокія пенсіі, пацверджаныя былым вышэйшым функцыянерам ЦК КПБ, Сакалову, Палякову, Дземянцею, іншым былым старшыням Вярхоўнага Савета (ці яго Прэзідыума) і мне былі прызначаныя так званыя пенсіі ў 3200 рублёў у месяц. ... Менавіта такую пенсію «за асаблівыя заслугі перад беларускім народам» — 3200 рублёў у месяц (менш за 1 еўра) я сёння і атрымліваю. Паводле нашых законаў я сам не магу звярнуцца ў Канстытуцыйны суд, каб суд гэта пацвердзіў. Таму... я прашу Вас звярнуцца ў Канстытуцыйны суд, каб ён вызначыў, наколькі адпавядае Канстытуцыі дэкрэт, згодна з якім мая пенсія ператвораная ў насмешку і ганьбішча не толькі таго, хто яе прызначыў сваім дэкрэтам, але і ўсе дзяржаўныя інстытуты, якія маюць дачыненне да сацыяльнага забеспячэння», — адзначае С.Шушкевіч.

ВЫБАРЫ-2011. ПРАГРАМЫ КАНДЫДАТАЎ

# Што абяцае кандыдат Міхалевіч

**Бізнэсу — заходнія рынкі, войску — сучаснае ўзбраенне і кантракт, вёсцы — зямельную рэформу. А вобласці падзяліць на драбнейшыя паветы.**

Праграма «Беларусь: стратэгія эвалюцыі» складаецца з трох частак і мае акцэнт на эканоміцы, пра што сведчыць назва першага раздзела — «Эканамічны рост». Рэшта праграмы прысвечаная «Эфектыўнай дзяржаве» ды «Актыўнаму грамадству».

У Беларусі няма будучыні без моцнай і канкурэнтнай гаспадаркі, лічыць Міхалевіч. Яго дыягназ: сёння наша эканоміка не паспявае за цывілізацыйнымі зменамі, а давяршаюць справу цэнтралізацыя ўлады, бюракратыя і недасканалая падатковая сістэма.

Палітык абяцае, што пры ім Беларусь будзе эканамічна прывабная, канкурэнтаздольная, прадказальная, дзелавая і разважлівая, прадпрымальная.

Дзеля гэтага плануецца скараціць колькасць падаткаў і фіскальных органаў, падвысіць узровень эканамічных свабодаў, адмяніць цэнавае рэгуляванне на камерцыйныя тавары і паслугі. Айчынная вытворчасць пяройдзе на міжнародныя стандарты якасці ды сучасныя тэхналогіі. Нацбанку абяцаецца ўзмацненне незалежнасці. Кандыдат заяўляе таксама пра развіццё крэдытнага рынку, стварэнне Агенцтва фінансавага развіцця.

Палітык закранае важныя пытанні ўласнасці на зямлю і энергетычнай незалежнасці. Абяцае зямельную рэформу, падтрымку фермерству, а таксама робіць стаўку на масавую вытворчасць экалагічна чыстай сельгаспрадукцыі.

Кандыдат збіраецца дыверсіфікаваць пастаўшчыкоў энергарэсурсаў ды стварыць нафтагазавы кансорцыум з удзелам Беларусі, Украіны, Расіі і Еўрасаюза.

Эфектыўная дзяржава, паводле Міхалевіча, — гэта ўзмацненне грамадскага кантролю за дзейнасцю дзяржаўных інстытутаў, незалежнасць судовай сістэмы, кантроль за дзейнасцю сілавых структур, свабода слова і адсутнасць цэнзуры, моцнае войска і годнае пенсійнае забеспячэнне.

Міхалевіч выступае за стварэнне на месцы КДБ новай службы бяспекі. За скасаванне ідэалагічных упраўленняў. За мадэрнізаванае войска, аснашчанае сучасным узбраеннем і пераведзенае на прафесійную аснову. Абяцае вайскоўцам павышэнне сацыяльнага статусу і паляпшэнне жыллёвых умоваў.

Міхалевіч за збалансаваную замежную палітыку. Разам з тым, галоўнымі задачамі ён бачыць доступ да заходніх рынкаў, тэхналогій і інвестыцый. Выступае за найхутчэйшае ўступленне ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Шанцы на далучэнне да Еўрасаюза рэалістычна ацэньвае як аддаленыя.

Важнае месца ў праграме займае экалагічны аспект. Кандыдат Міхалевіч рэзка супраць АЭС у Беларусі. Лічыць, што нам па сілах стаць адным з еўрапейскіх цэнтраў зялёнага руху.

Актыўнае грамадства немагчымае без самакіравання. Міхалевіч абяцае дэцэнтралізацыю палітычнай, эканамічнай і фінансавай улады на карысць рэгіянальнай. Абяцае падзяліць шэсць сучасных абласцей на 17 адміністрацыйных адзінак — паветаў — з цэнтрамі ў Брэсце, Пінску, Мазыры, Гомелі, Гродне, Баранавічах, Слуцку, Бабруйску, Лідзе, Маладзечне, Барысаве, Магілёве, Крычаве, Глыбокім, Полацку, Віцебску і ў Оршы. Каб уладу наблізіць да людзей. Бо што за парадак, калі ад Астраўца бліжэй да Мінска, чым да Гродна?

Абяцае скасаваць прымусовае размеркаванне ў сферы адукацыі, у медыцыне — прыняць закон аб абароне правоў пацыента. Рэлігійным арганізацыям абяцае бясплатную зямлю пад цэрквы і шырокія магчымасці для місіянерскай дзейнасці.

Культурная Беларусь — гэта пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы, аднаўленне і рэстаўрацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей, конкурсная падтрымка творчых людзей.

Надзвычай важнай умовай для захавання беларускай ідэнтычнасці з'яўляецца супрацоўніцтва з дыяспарай. Міхалевіч выступае за ўвядзенне Карты беларуса і абяцае ўсялякае спрыянне прадстаўнікам нацыянальных меншасцяў Беларусі.

**Сямён Печанко**

# Плады «супрацьусіхства»

**Украіна паказала, да чаго прыводзіць максімалісцкі байкот. Піша Віталій Панамароў (Кіеў).**

Мы ўсе ведаем са школы, што палітыка — гэта мастацтва магчымага, але часта забываемся пра гэта, калі надыходзіць час рабіць сапраўдны выбар. Хай маім беларускім сябрам дапаможа свежы досвед Украіны.

Ніколі за апошнія 19 гадоў Украіна не была так блізка ад страты незалежнасці, як цяпер — праз 100 дзён пасля пятых прэзідэнцкіх выбараў. На выбарах шанцы праеўрапейскай Юліі Цімашэнкі выглядалі нават большымі за шанцы прамаскоўскага Віктара Януковіча. Многія выбаршчыкі бачылі яе слабыя месцы, але схіляліся да падтрымкі Цімашэнкі як «меншага зла», асабліва пасля яе заявы пра тое, што яна будзе дамагацца поўнай энергетычнай незалежнасці Украіны.

Але частка апанентаў Януковіча заклікала галасаваць супраць усіх. Маўляў, абодва кандыдаты далёкія ад нацыянальнага ідэалу. І хоць праваслаўны і грэка-каталіцкі патрыярхі перасцерагалі ад гэтага, у 2-м туры больш за 4% выбаршчыкаў прагаласавала «супраць усіх», а Януковіч набраў на 3% галасоў больш за Цімашэнку.

Вось так «супрацьусіхі» разам з выбаршчыкамі-«абстынентамі» дапамаглі Януковічу перамагчы. І цяпер ім застаецца хіба што лічыць, колькі гадоў ім будзе ў 2042 — да гэтага часу ва ўкраінскім Севастопалі будуць стаяць расійскія баявыя караблі.

# Раманчук: Эканоміка найперш

**Праграма кандыдата ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі Ярослава Раманчука называецца «Мільён новых працоўных месцаў для Беларусі».**

Праграма на дваццаці дзвюх старонках цалкам складаецца з эканамічнага блока. Таго, у якім кандыдат Раманчук разбіраецца найлепш.

«Працоўныя месцы — у цэнтры ўвагі ўсёй эканамічнай і сацыяльнай палітыкі, — пачынаецца праграма кандыдата. — Новыя працоўныя месцы — гэта паказчык таго, што краіна жыве, абнаўляецца і ідзе наперад. Гэта доказ таго, што Беларусь цікавая для інвестараў. Няма сумневаў, што новыя рабочыя месцы — гэта эканамічная аснова для падтрымкі традыцый, развіцця нацыянальнай культуры і мовы».

На думку Раманчука, захаванне сённяшняй сістэмы на рынку працы пагаршае сітуацыю, асабліва з улікам дэмаграфічнай сітуацыі.

«Для дынамічнага развіцця рынку працы неабходная паўнавартасная лібералізацыя ўмоваў выхаду на рынак, выхаду з яго і працы ў ім, — зазначае кандыдат. — Неабходна таксама перагледзець дзейсную сістэму штрафаў і пакаранняў, істотна знізіць падаткова абавязак, забяспечыць фармаванне рынку нерухомасці з адначасовым зніжэннем арэндных ставак».

Раманчук прапаноўвае чатыры крыніцы для стварэння новых працоўных месцаў: 1) прадпрымальнікі, 2) малы бізнес, 3) замежныя інвестары, 4) дзяржаўныя прадпрыемствы, што прайшлі мадэрнізацыю.

Для дасягнення пастаўленай мэты Раманчук выдзяляе наступныя пункты: фінансавая, інфармацыйная, адукацыйная падтрымка беспрацоўных, мадэрнізацыя інфраструктуры (дарогі, ЖКГ, абарона экалогіі), развіццё фінансавых інстытутаў, расшырэнне рынкаў збыту тавараў (найперш гаворка пра Расію і краіны-ўдзельніцы «Усходняга партнёрства»), адаптацыя сістэмы адукацыі да патрабаванняў рынку працы, бяспека чалавека і культура працавітасці.

«Захоўваць лепшае і ствараць новае — гэта беларуская нацыянальная ідэя», — заканчваецца праграма Раманчука.

Усё ж адной эканомікі замала, каб правесці цэласную прэзідэнцкую кампанію. Цікава, што ў кампаніі «Гавары праўду» адным з цэнтральных пунктаў стаіць акурат барацьба з беспрацоўем.

**Зміцер Панкавец**

# Хваёвая ванна Свіцязі і ўсё, што навокал

Навагрудак—Горная Рута—Лоўчыцы—возера Свіцязь—Завоссе—Дзятлава—Слонім—Сынкавічы—Жыровічы. Піша **Андрэй Дынько**.

Возера Свіцязь пакрытае тонкім гарчычным налётам. Ніякай катастрофы. Гэта сосны цвітуць навокал. Свіцязь чыстая-чыстая, празрыстая. Прыехаць на яе ў перадапошнія выхадныя мая было добрай ідэяй. Адпачынкоўцаў яшчэ вобмаль, а вада ўжо лагодная.

Пляж упрыгожваюць камяні з напісанымі фарбаю цытатамі са «Свіцязянкі». Але інфраструктуры для адпачынку дзікіх турыстаў папранейшаму няма. Колісь знакаміты рэстаран сярод векавых грабаў ляжыць у руінах. Ані грамадскага харчавання, ані пракату. Толькі здатныя бізнэсоўцы прывезлі надзіманы шар, у якім можна хадзіць па вадзе акі посуху. Дзеці шалеюць, бацькі таксама — 5 тысяч рублёў за 5 хвілінаў.

Налятае мімалётная навальніца, шар ляціць па хвалях, і пляж пусцее. Жоўтыя хвалі б'юцца сярод каранёў прыбярэжных дубоў.

Калі б ты, падарожнік, ні ехаў побач, на Свіцязь варта завярнуць. Так рабіў яшчэ Яраслаў Мудры, а Міндоўг і Ягайла гэтаксама, як і ты, вячэралі пад дубамі.

## Замак у Навагрудку

Замак у Навагрудку — яшчэ адно месца, дзе можна бываць безліч разоў, і не астынеш, і гонар за вялікіх нашых продкаў, жаданне быць роўнымі ім агорне цябе.

З кожным годам тут болей турыстаў. На выхадных не спадзявайцеся пабыць на гэтай гары на самоце.

Заслугоўвае ўвагі драўляная забудова навакольных вуліц — мілыя жылыя хаты 1920—1930-х.

У старым парку пад валамі пракладзеная лыжаролерная траса, на якой трэніруюцца чэмпіёны.

Краязнаўчы музей у Навагрудку рэдкасна цікавы і дарослым, і дзецям сваім багаццем аўтэнтычных экспанатаў і яснымі рэканструкцыямі.

Насупраць музея знойдзеце якасную кавярню, на суседняй вуліцы Савецкай — рэстарацыю «Свіцязь» савецкага тыпу.

## «Гарчыца руская» і шкло з Бярозаўкі

У крамах прадаюцца ўсе гатункі гродзенскага і лідскага марозіва, ваўкавыскіх кілбасаў. Таксама трапілася рэдкая ў наш час тэрмаядзерная «Гарчыца руская» без кансервантаў, якую вырабляе Радунскі каапгандаль, дай бог яму здароўя.

Мясцовыя сувеніры — гэта найперш шкло з Бярозаўкі, якое за апошнія гады моцна змяніла свой стыль. Дарэчы, да самой Бярозаўкі ад Навагрудка зусім блізка па гродзенскай трасе, а Бярозаўка стаіць на Нёмане.

## Беларускія мугіры

З экзотыкі — татарскія сляды яшчэ бачныя ў гэтай калысцы ВКЛ.

У Навагрудку на вуліцы Леніна стаіць мячэць, у якой можна пабачыць традыцыйныя мугіры — тканыя або пергаментныя ўпрыгожванні з выказваннямі са святых кніг. Каб трапіць у храм, трэба шукаць прадстаўнікоў татарскай грамады.

Не ўсе ведаюць, што нашы беларускамоўныя татары захоўваюць традыцыю пісання беларускай мовай, але арабскімі літарамі. Беларуская арабіца выкарыстоўваецца дагэтуль.

Самая знакамітая мячэць у гэтым краі — у Лоўчыцах, што на захад ад Навагрудка, трохі ўлева ад гродзенскай трасы. Яна была збудавана ў 1688 годзе. Захавалася часткова.

Мячэць ёсць і ў Слоніме.

## «Цябе той цэніць, хто ўжо страціў»

Дом-музей паэта-класіка Адама Міцкевіча можна наведаць у самім Навагрудку, дзе прайшло юнацтва паэта. Туды ж з'язджаюцца вяселлі з наваколля. Мы ж пракаталіся яшчэ і ў Завоссе — месца нараджэння паэта.

Літва! Мая айчына! Ты — нібы здароўе!
Цябе той цэніць, хто ўжо страціў. Зноў і зноў я
Табою мрою, зноў ты ў снах перад вачыма.
Вярнуць цябе хачу я ў слове хоць, Радзіма!..

У Завоссі ўзведзены маёнтак пачатку XIX ст. Будынкаў шмат, нават лазня ёсць, аб'ект-мара сучаснага моцнага гаспадара, — дзейная, калі Вам пашчасціць.

Стыль адбудовы — блізкая да арыгіналу стылізацыя. Скажам, папярэчыны агароджы прыбітыя да стоўпчыкаў цвікамі, але для понту на іх накручаныя лазіны: тыпу, калісьці плялі вось так.

Застаецца спадзявацца, што якасць пабудовы будзе лепшай, чым у Навагрудку, дзе ў доме-сядзібе коміны склалі з неадпаведнай цэглы, і яны пасыпаліся ўжо.

Каля самага маёнтка самаўпэўнены заяц у нас на вачах пасецца ў маладой кукурузе. Бачыць нас, але рэагуе гордай абыякавасцю, пакуль мы не шыбуем проста на яго. Тады ён адбягае на пару дзясяткаў метраў і спыняецца. От, маўляў, назолы.

Дарога да Завосся пракладзеная беззаганна. Кантрастам да яе, гладзенькай, — дрымотныя вёскі ва-



Тут нараджалася Вялікае Княства.




Козы абжылі замкавыя валы і Курган несмяротнасці.



Маленькі шэдэўр драўлянай архітэктуры Навагрудка.



Музей Міцкевіча ў Навагрудку.



Возера Свіцязь.

### Навагрудак

140 км ад Мінска, 160 км ад Гродна. Горад месціцца на Навагрудскім узвышшы. Самы высокі пункт узвышша — Замкавая гара ў самім Навагрудку. Сярэднія тэмпературы там на некалькі градусаў ніжэйшыя, чым у навакольных вёсках. Навагрудак быў рэзідэнцыяй караля Міндоўга, беларускіх праваслаўных мітрапалітаў. Радзіма Адама Міцкевіча. Захаваліся шматлікія помнікі архітэктуры і ансамбль забудовы.

### Слонім

200 км ад Мінска, 140 км ад Гродна. Горад на рацэ Шчара. Вотчына князёў Агінскіх. Тут дзейнічаў тэатр Агінскіх (захавалася вуліца Оперная). Захаваліся шматлікія помнікі архітэктуры і ансамбль забудовы.

### Царква ў Сынкавічах

месціцца адразу на захад ад Слоніма, у самым пачатку Зэльвенскага раёна. Збудавана ва ўнікальным стылі абарончай готыкі ў канцы XV ст. Уражвае, нягледзячы на перабудову царскае пары.

### Жыровіцкі манастыр

на поўдзень ад Слоніма, збудаваны ўніятамі–базыльянамі на беразе Шчары — знакамітае месца паломніцтва. Паўстаў на месцы, дзе пастушкі знайшлі ў гаі на грушцы каменны абразок Маці Божай, які рабіў цуды. У падрасійскія часы тут быў цэнтр Літоўскай царкоўнай епархіі. Архітэктура кляштара спалучае рысы барока, ракако і класіцызму.



Гатэльчык у Дзятлаве.

**Якасныя аграсядзібы, дзе можна заначаваць:**

**Грачыхі**, Баранавіцкі раён

**Навасады**, Навагрудскі раён, 2 км ад Свіцязі

**Верас**, Зэльвенскі раён

**Варонча**, Карэліцкі раён

**Лаўрыновічы**, Зэльвенскі раён

**Амневічы**, Карэліцкі раён

**Больш інфармацыі на ruralbelarus.by**

кол, дзе, здаецца, ніхто не будаваўся ўжо гадоў дваццаць. І пяшчоту, і шчымлівасць выклікаюць гэтыя вёскі — мы заязджалі яшчэ ў Горную Руту, што побач з Ваўкавічамі, дзе летась аднавілі царкву і паставілі помнік закатаванаму саветамі святару.

На шчасце, на Наваградчыне не вымерзлі сады. А вось на Міншчыне вялікая доля яблынь і грушаў не вытрымала сівернай зімы 2010-га.

## Сюрпрыз: Дзятлава

Да Свіцязі вядзе дарога Наваградак—Баранавічы, яна ў ідэальным стане, як і ўсе дарогі Гарадзеншчыны. Нават дарога раённага значэння між вёскай Валеўка, што каля Свіцязі, і мястэчкам Навальня — дасканалы асфальт. Можна максімальна камфортна і хутка падарожнічаць на легкавіку любога тыпу.

Дарога бяжыць праз прыгожыя бары на ўзгорках над шырокімі далінамі. Вакол рассцілаюцца прывабныя пейзажы. Пятляе чыстая рэчка Ятранка.

Побач застаецца Babaкомшчына — малая бацькаўшчына пісьменніцкага роду Адамчыкаў.

Мінаем Стараельню і Наваельню. Але ельнікаў нідзе не відаць, таму прыходзіць думка пра перакручаны балцкі корань гэтага тапоніма. На Дзятлаўшчыне доўга трымаліся паселішчы неасіміляваных балтаў — паводле некаторых звестак, тут у асобных вёсках на балцкіх дыялектах размаўлялі аж да XIX ст.

Нечаканая знаходка ў падарожжы — Дзятлава. Гарадок стварае ўражанне выдатнай заможнасці. Дамы масава разбудоўваюцца. Не аграгарадковыя шпакоўні паўстаюць паказушна на галі. Не, разбудоўваюцца самі людзі, усярэдзіне горада.

Цэнтр Дзятлава захаваў далікатныя элементы старой архітэктуры і своесаблівы дух, скандэнсаваны ў людным у нядзелю цэнтры, на былым Рынку. Тут варта запыніцца на пару гадзінаў, каб перакусіць, пагуляць і папрактыкавацца ў фатаграфаванні.

## Пчолы ў байніцах

Дарога з Дзятлава на Слонім ідзе пераважна праз лясы. Да Сынкавічаў трэба ехаць праз горад, выбіраючы кірунак на Ваўкавыск, Масты, Гродна. Ніякіх пазнак, як выязджаць да сынкавіцкага шэдэўра, няма.

Людзям з тонкімі салоннымі насамі варта ў Сынкавічы з сабой браць супрацьгазы. Вялікая ферма побач стварае пастаяннае амбрэ.

Унутры царквы неяк бязладна застаецца. На падлозе працёртыя дываны, кавалкі лінолеуму. Бацюшка наспех расказвае два словы шматлікім экскурсантам. Пра саму царкву — мала. Больш — пра ўласцівасці абразоў і пра тое, у якім месцы царквы ставяць свечкі за здароўе, а ў якім — за спачын.

Рэстаўрацыя будынка працягваецца. Пакуль яна выразілася ў дабудове кічаватай званіцы з бліскучай цыбулінай перад царквой.

Праходу ў вежы для турыстаў няма, хоць дзецям тое было б так цікава, а прасіць бацюшку пра асаблівую ласку сярод гэтых турыстычных тлумаў не выпадае.

Заехаць у Сынкавічы ўсё ж варта. Надта ж вялікая гэта архітэктурная краса.

А ў байніцах царквы, як і за Скарынам, селяцца пчолы. Пчолы бароняць вуллі свае...

## Пытанне абеду

Заўважна палепшаў узровень сэрвісу ў вясковых крамах. Не толькі прыватныя, але і белкаапсаюзаўскія пераважна працуюць і ў суботу—нядзелю, дый у суботу дапазна. Асартымент прадуктаў салідны. А вось корчмаў і кавярняў паранейшаму вобмаль. У цэнтры Наваградка турыст зможа паесці (акрамя змрочна-легендарнага бара «Рым» на галоўнай плошчы, у якім жорстка п’е мясцовы люд; з дзецьмі лепей не сунуць носа), а ў цэнтры Слоніма — не.

Слонім Агінскіх, «Паланэза», Шчары, з перлінамі Сынкавіч і Жыровіч побач, з унікальнай канцэнтрацыяй храмаў у цэнтры горада, з велічнымі і гістарычнымі могілкамі, з вузкімі вулкамі і захаванай барочнай сінагогай застаецца неадкрытым скарбам. Сюды маглі б ездзіць турысты-палякі і юдэі, турысты-музыкі і праваслаўныя, але пакуль што яны сюды не едуць, а праязджаюць.

## Манастырская кухня

Не марнуйце час на пошук абеду ў Слоніме, пад’есці можна добра ў Жыровічах.

Ёсць савецкага тыпу кавярня «Ялінка» побач з паркінгам. Але найлепш — у самім манастыры, дзе маецца маленькая, але з якаснай ежай трапезная, дзе кормяць стравамі, адпаведнымі праваслаўнай кухні, па прымальных цэнах. Даросламу наесціся можна за 6000 руб. У наш прыезд гэта была смажаная і вараная бульба, катлеты-бульбянікі, рыбныя стравы, хатнія булачкі і пернікі. Сімпатычнае месца для перакусу, аднак у гадзіну пік прыйдзецца стаяць, бо столікаў з крэсламі толькі два.

У Жыровічах сканчаецца вялікая рэстаўрацыя. Па-пад кляштарам з бляскам адноўленыя карпусы, у іх размясціліся Духоўная акадэмія і інтэрнат. Вялікі ўнутраны двор паміж імі ў перспектыве мог бы стаць утульным месцам правядзення музычных фэстаў, малітваў на паветры і проста месцам прыёму паломнікаў. Бадзёрыя семінарысты ў спартовых трусах з мячамі вяртаюцца з футбольнага поля. Аўтобусы з паломнікамі — дакладней, збольшага паломніцамі — запаўняюць невялікі паркінг праз дарогу.

## Са сваімі шортамі ў чужы манастыр

Шмат народу збіраецца ля «святых крыніц». Тут жа сядзіць салідная чарга ў купальню на святой вадзе.

На горцы за крыніцамі аднавілася традыцыя ўпрыгажэння аброчнага дрэва. Толькі цяпер на стары дуб не вешаюць ручнікі, як калісь, а проста навязваюць стужачкі.

У сам манастыр абы-як не пускаюць. Мужчынам мусова мець доўгія штаны, а жанчынам — спадніцы і хусткі. Апошнія выдаюць на ўваходзе, а вось без штаноў, гэта значыць у шортах — нікуды.

У сярэдзіне манастыр, як і любы іншы, мала мяняецца з часам. Паболела хіба пунктаў продажу рэлігійнай атрыбутыкі.

Мёд тут прадаецца свой, з вялікай манастырскай пасекі. І свечкі тут з сапраўднага воску, пахнуць мёдам. Пахнуць так, што хочацца заплюшчыць вочы.

**Фота Паўліны Купрысь**

**З іншых цікавых аб’ектаў для наведвання непадалёку:**

**Мір** — знакаміты замак,

**Ішкальдзь** — царква вялікалітоўскага перыяду,

**Зэльва** — радзіма і магіла Ларысы Геніюш,

**Загор’е** — сяліба Янкі Брыля,

**Ружаны** — велічны палац Сапегаў,

**Любча** — прыватная асоба адбудоўвае замак,

**Мерачоўшчына** — сядзіба Касцюшкі.



**На дуб над жыровіцкай крыніцай паломнікі павязваюць аброчныя стужкі.**



**Перад Сынкавіцкай царквой вырасла цыбуліна.**



**Адрэстаўраваныя карпусы ў Жыровічах змясцілі Духоўную акадэмію.**



**Бар «Рым» на цэнтральнай плошчы Наваградка — месца не для дзяцей.**



**Старая хата з мініяцюрнымі акенцамі ў Горнай Руце.**



**Трасянка наваградская.**



**Завоссе. Тут нарадзіўся Міцкевіч.**


PHOTO BYMEDIA.NET

# 3+2=0

**На «Еўрабачанні–2010» перамагла Лена Маер з Германіі. Беларусь — другая. Ад канца.**

Пераможца набрала 246 балаў. Другое месца заняла Турцыя (170), трэцяе — Румынія (145). Украіна стала дзясятай, а Расія — адзінаццатай. Апошняя, дваццаць пятая, — Вялікабрытанія.

Беларускаму гурту «3+2» налічылі балы толькі чатыры краіны: Грузія — 12, Малдова — 3, Расія — 2, Балгарыя — 1.

Ад пачатку галасавання стала зразумела, што беларусы не ўвойдуць нават у дзясятку найлепшых. Бо першыя дванаццаць краін нам нічога не паставілі. Беларусь нібы не заўважалі. Калі паўднёвыя і заходнія славяне падтрымлівалі адзін аднаго, то нашу краіну ігнаравалі нават славяне.

Сёлета была зменена сістэма галасавання. Палову балаў вызначалі гледачы, а другую палову — журы. Наколькі аб'ектыўна ацэньвала журы? Сказаць цяжка. Але верагодна, што яны найперш ацэньвалі чыстату выступу выканаўцы. Хоць гэта было рэдкасцю на фінале.

Вынікі галасавання з Беларусі агучваў алімпійскі чэмпіён Аляксей Грышын. Яго англійская мова выклікала ўсмешку. А найвышэйшыя балы беларусы размеркавалі па-сваяцку: Ізраіль — 8, Украіна — 10, Расія — 12.

Агульнае ўражанне ад сёлетняга фіналу — не было нічога, што шакавала б, як калісь фінскі гурт Lordi ці балерына з раяля ў расійца Дзімы Білана. Была адна пазасцэнарная неспадзяванка: падчас выступу іспанца на сцэне з'явіўся невядомы чалавек з залы. Паліцыя вывела яго. А выступ прыйшлося перанесці.

**Гурт «3+2» быў створаны спецыяльна пад «Еўрабачанне».**

Песню для «3+2» напісаў расійскі прадзюсер Макс Фадзееў. Ён паспяшаўся адхрысціцца ад свайго ўдзелу ў правале «3+2» і абвінаваціў тэлеканал АНТ у падмане.

«Тое, што я ўбачыў у эфіры, выклікала ў мяне ў шок. Музыку дапісалі, касцюмы — неверагодныя», — адзначае ў адкрытым лісце да прадстаўнікоў СМІ Фадзееў. Ён таксама сцвярджае, што пасля паўфіналу ні разу не тэлефанаваў беларусам.

Аднак, паводле слоў Сяргея Хоміча, ён размаўляў з Фадзеевым пасля першага паўфіналу. «Фадзееў пазітыўна настроіў музыкантаў, нумар яму спадабаўся, у тым ліку і ідэя з крыламі», — сказаў першы намеснік старшыні кіраўніцтва ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал».

Хоміч заявіў, што яму складана каментаваць апошнія выказванні Фадзеева, паколькі «яны зробленыя ў абсалютна розным ключы».

У 2007 г. беларусу Дзмітрыю Калдуну спрабаваў дапамагаць на «Еўрабачанні» расійскі спявак Філіп Кіркораў. Вынік быў лепшы, але падобны: 6-е месца.

Вядучы Дзяніс Кур'ян, які каментаваў «Еўрабачанне» на БТ, адзначыў, што пасля сёлетняга конкурсу мо спыняць траціць грошы на замежных аўтараў, а звернуць увагу на айчынных.

Ці так гэта будзе — пабачым налета ў Германіі. Ужо вядомыя даты правядзення «Еўрабачання-2011»: 17,19, 21 мая.

**Кастусь Матушыч; БелаПАН**

## Мінск: 6 беларускамоўных школаў і 8 школаў набіраюць беларускамоўныя класы

З 1 чэрвеня пачаўся набор у 1-я класы. Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

Акрамя шасці беларускамоўных гімназій і школ, восем школ Мінска набіраюць асобныя беларускамоўныя класы. Старшыня Таварыства беларускай школы Алесь Лозка нагадвае, што бацькі першакласнікаў маюць канстытуцыйнае права падаваць заяву на навучанне па-беларуску ў любую школу.

**Гімназія №4 (вул. Кунцаўшчына, 18)** прапануе навучанне ў фізіка–матэматычных, хіміка–біялагічных і філалагічных класах.

Даведка: e–mail: gymn4.minsk.edu.by, т.: (017) 258–49–71, 258–49–74.

***

**Гімназія №23 (пр. Незалежнасці, 45)** прапануе вывучэнне прадметаў па–беларуску, а таксама выкладанне на высокім узроўні англійскай, кітайскай, польскай моваў.

Даведка: e–mail: gymn23@minsk.edu.by; т.: (017) 284–47–62, 284–87–16.

***

**Гімназія №9 (вул.Сядых, 10)** — вывучэнне ўсіх прадметаў па–беларуску, паглыбленае вывучэнне англійскай мовы, факультатыўнае — польскай. Прапануе вывучэнне прадметаў музычнага цыкла.

Даведка: т.: (017) 283–04–21, 281–38–04.

***

**Гімназія №28 (пр.Ракасоўскага, 93)** прапануе выкладанне ўсіх прадметаў на роднай мове, а таксама паглыбленае вывучэнне французскай мовы, міжнародныя абмены, выкладанне прадметаў на французскай мове (краіназнаўства, літаратура Францыі) па праграмах, распрацаваных настаўнікамі школы.

Даведка: e–mail: sch2@minsk.edu.by.; т.: (017) 248–32–02, 248–12–64.

***

**Гімназія №14 (вул. Васняцова, 10)** прапануе паглыбленае вывучэнне замежных моваў, спецкурсаў па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы і шмат іншага. На базе гімназіі дзейнічаюць фальклорны ансамбль, музеі, літаратурная студыя і студыя бальных танцаў.

Даведка: т.: (017) 295–01–33, 295–21–31.

***

**СШ №190 (вул.Нікіфарава, 19)** — выкладанне на беларускай і расійскай мовах. Школа прапануе таксама бясплатную музычную адукацыю і спартыўныя секцыі.

Даведка: т.: (017) 260–24–90; e–mail: sch190@minsk.edu.by.

***

**Школа №60 (вул.Лібкнехта, 82)** — навучанне з музычным ухілам. У школе дзейнічаюць шматлікія гурткі, клубы, музей, творчыя і грамадскія аб'яднанні.

Даведка: т: (017) 208–69–74, 209–94–49.

***

**СШ №68 (зав. Ахоцкі, 17)** прапануе навучанне па–беларуску. Набор у класы з фальклорна–тэатральным напрамкам.

Даведка: e–mail: sch68@minsk.edu.by; т. (017) 243–76–82.

### Белмоўныя класы ў расійскамоўных школах

**СШ №11 (вул. Асаналіева, 14)** — школа з агульнаэстэтычным ухілам.

Даведка: т.: (017) 277–45–34, 275–59–10.

***

**СШ №72 (вул. Халмагорская, 59)** — сёлета будзе набірацца адзін беларускамоўны першы клас. Дадаткова — вывучэнне англійскай мовы, мастацкі ўхіл.

Даведка: т.: (017) 246–53–71, 246–52–42.

***

**СШ №108 (вул. Уральская, 15)** — спартыўныя гурткі і секцыі, вечаровыя класы.

Даведка: e–mail: sch108@minsk.edu.by, т.: (017) 245–20–41.

***

**СШ №131 (вул. Убарэвіча, 74)** — вывучэнне замежных моў (нямецкай, польскай, французскай, іспанскай, шведскай), харэаграфіі.

Даведка: т.: (017) 340–62–38, 345–14–12.

***

**СШ №180 (вул. Радужная, д.8, корп.3)** — паглыбленае вывучэнне англійскай мовы.

Даведка: т.: (017) 250–10–49.

***

**СШ №209 (вул. Рафіева, 91)** — вывучэнне французскай мовы, вакальныя студыі, спартыўныя секцыі.

Даведка: т. (017) 274–69–71, 256–48–77.

Да чытачоў. Дасылайце ў рэдакцыю інфармацыю пра беларускамоўнае навучанне ў вашай вобласці і раёне. Пішыце пра новыя ініцыятывы бацькоў і ўпраўленняў адукацыі.

**Сямён Печанко**

# Шнураў мацюкаўся, «Ляпіс Трубяцкой» чытаў Купалу

**29 мая ў Сілічах прайшоў рок–фестываль «Паляна».**

Гэта быў адзін з самых масавых фэстаў на адкрытым паветры ў Беларусі за апошні час. Фестываль сабраў некалькі тысяч чалавек, хоць за ўваход на пляцоўку трэба было заплаціць 40—60 тысяч рублёў. Летась на бясплатны «Рок за баброў» таксама ў Сілічах людзей прыехала столькі сама. Хаця такую масавасць «Паляны» можна растлумачыць тым, што выступаў «Ляпіс Трубяцкой».

Мінуў год, як «Ляпісы» не гралі сольных канцэртаў у Мінску. Таму яго прыхільнікі з'ехаліся з усёй краіны.

Адкрываў фэст гурт «Унія». Літаральна тыдзень таму каманда выступіла ў Мінску на «Дударскім фэсце». Летась на тэлеканале СТБ удзельнічала ў музычнай праграме «Зорны рынг», дзе па выніках галасавання гледачоў перамагла «Верасы».

«Пару рублей» гралі расійскамоўны ска. Іх ужо паспелі ахрысціць беларускім «Ленінградам», але без мацюкоў. Калі б заімі выходзіў Шнураў са сваёй былой камандай, то вялікай розніцы слухачы не адчулі б.

Не ўсе з прысутных ведалі, што цяпер іграе Шнур з новым гуртом «Рубль». Перад фэстам аптымісты казалі, што музыка змяніўся. Маўляў, піша прыстойныя тэксты. Куды там!

Ніводная яго песня не абышлася без мацюкоў.

«Ляпіс Трубяцкой» выступаў дзве гадзіны. Паміж песнямі Сяргей Міхалок чытаў вершы, у тым ліку па-беларуску.




Адзін з твораў («Хто ты гэткі?») ён прачытаў з Янкі Купалы. Новых песень гурт не выконваў. Але праспяваў «Belarus Freedom», якую ў Беларусі на канцэртах «Ляпісаў» пачуеш нячаста.

Праз тыдзень, 5 чэрвеня, у Сілічах пройдзе «Рок за баброў». «Воплі Відаплясава», «Без Білета», «Градусы» выступяць на адной сцэне.

**КМ**

## КАЛЯНДАР

### Чэрвень

**1** — Міжнародны дзень абароны дзяцей.

**1** — 100 гадоў таму ў Гомелі была заснаваная першая беларуская футбольная каманда ПГФК (Першы гомельскі футбольны клуб).

**5** — 100 гадоў таму былі ўрачыста перанесеныя мошчы святой Еўфрасінні Полацкай з Кіева-Пячорскай лаўры ў Полацк.

**13** — Сабор беларускіх святых. Штогод гэтае свята адзначаюць у 3-ю нядзелю пасля Тройцы.

**23** — Купалле.

**29** — Пятра і Паўла ў каталікоў, уніятаў.

## «Давай, Андруха, ішчо!»

**— крычалі Андрэю Хадановічу мінскія гопнікі, калі ён чытаў вершы ля помніка Пушкіну.**

У Мінску адбыўся вулічны фэстперфоманс «Мінскі карнавал».

Усё было — спантанней не прыдумаеш. Нядзельным адвячоркам пляцоўку перад мінскай ратушай акупавалі Марыя Мартысевіч і Андрэй Адамовіч, якія пад акампанемент гурта «Рэлікт», дэкламавалі у народ уласныя вершы. Каля «Дома мод» чыталі свае вершы выпадковым мінакам Вера Бурлак і Віктар Жыбуль.

Адпалілі не толькі чытальнікі, але і гледачы, якія фактычна зрабіліся саўдзельнікамі фэсту. Падчас фаершоу «Палымяны бармаглот» і адначасовага выступу Андрэя Хадановіча, які публічна чытаў вершы ля помніка Пушкіну, двое маладзёнаў гучна бажыліся, што «гэта круцей за «Камеды-клаб!»!

Ля падножжа помніку вялікаму расійцу сабралося чалавек 100: і аматараў мастацтва, і нават зацікаўленых гопнікаў. Зыкі беларускага слова так прыпалі да душы апошнім, што яны выклікалі Хадановіча чытаць на «біс»: «Давай, Андруха, ішчо!»

Ля кінатэатра «Масква» паэту Віталю Рыжкову акампанаваў гурт «Рэлікт». Двое АМАПаўцаў, што туляліся за спінамі музыкаў, спыталіся, ці выступоўцы ў парадку. Пачуўшы ў адказ аптымістычнае «так», на пацеху грамадзе гучна пачалі перадаваць па рацыі, што «ўсё ў парадку».

Мэтай фэсту «Мінскага карнавалу» было вывесці беларускае мастацтва з сутарэнняў. Выхад удаўся.

**ЛК**

# Пінігін адмовіўся здымаць «Каласы пад сярпом тваім»

Галоўны рэжысёр Купалаўскага тэатра не будзе супрацоўнічаць з «Беларусьфільмам».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«Гэта немагчыма — пакінуць тэатр на паўтара года яго кіраўніку, вы ж разумееце. Я думаў, што неяк удасца, але гэта немагчыма: чатыры серыі плюс поўны метр», — патлумачыў сваё рашэнне рэжысёр і выказаў вялікае шкадаванне, што не выпадае магчымасці папрацаваць над такой стужкай.

Хто стане рэжысёрам «Каласоў»?

«Мікалай Пінігін адмовіўся некалькі дзён таму. А вы ж самі разумееце, што знайсці рэжысёра — гэта не аднаго дня справа. І таму пакуль я вам не магу назваць ніводнага прозвішча верагодных кандыдатур», — кажа прэс-сакратарка кінастудыі Валянціна Белякова.

Адсутнасць рэжысёра прывяла да таго, што дагэтуль не пачалі выбіраць акцёраў. Невядома пакуль дакладна, і калі пачнуцца здымкі.

Сцэнарый таксама пакуль не гатовы. Як паведамлялася раней, яго піша Аляксандр Качан, вядомы па стужках «Акупацыя. Містэрыі» і «Макра». Сцэнарыст абяцае напісаць тэкст своечасова — да сярэдзіны ліпеня.

«Палова сцэнара напісана. Я, дарэчы, ужо паказваў першую серыю — гэта чатырохсерыйны праект. І гэта цалкам адпавядае той аўтарскай мадэлі, якая ў мяне заключаная з «Беларусьфільмам». Так што праца ідзе адпаведна графіку, мая праца».

Што ж тычыцца Пінігіна, то, кажа Качан, ён разумее прычыны ягонай адмовы. На кінастудыі сцэнарыста запэўнілі, што да таго часу, пакуль ён закончыць сваю працу, будзе названы і рэжысёр фільма.

**Зміцер Лукашук, «Еўрарадыё»**




## У саламяных лялек з’явіліся канкурэнты

Фірма «Каляровы парасон» выпусціла сувеніры на беларускую тэматыку.

Гэта магніты і кубкі з выявамі Мінска, Міра і надпісам «Belarus».

Пакуль з’явіліся сувеніры з шасцю выявамі. Дырэктар «Каляровага парасона» Сяргей Васілеўскі адзначыў, што выпуск такой прадукцыі будзе працягнуты.

«Наш брэнд — Беларусь, — падкрэслівае сп. Васілеўскі. — І трэба, каб не толькі зубры і саламяныя лялькі прадаваліся ў якасці сувеніраў».

Замовіць магніты можна праз сайт knihi.by.

**Кастусь Матушыч**

IN MEMORIAM



## Андрэй Вазнясенскі

Пра папулярнасць Андрэя Вазнясенскага у 1960-я гады можна меркаваць па фотаздымках ланцугоў коннай міліцыі, якая стрымлівала натоўп ягоных прыхільнікаў. У 1970-я гады яго паэзію чыталі ў тым ліку і «між радкоў» — так, фразу «в летаргическом веке пробудится от галиматьи» з верша пра Гогаля мы ўспрымалі датычною больш да нашага, брэжнеўскага часу, чым да царскага, «мікалаеўскага» перыяду.

У Вечнасці застануцца паэтычныя радкі Вазнясенскага, але віцябляне ўдзячныя яму і за вяртанне Шагала. Ён шмат нам у гэтым дапамагаў, і ліст у абарону ідэі стварэння музея Шагала ў Віцебску падпісаў разам з Быкавым і Барадуліным.

**Сяргей Навумчык, Радыё «Свабода»**

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

## Што пачытаць улетку?

Раман пра суровых фінскіх хлопцаў, вядома!

### Гарачы шведскі фін

Мікаэль Ніемі ў Скандынавіі чалавек знакаміты: яго перакладаюць і перавыдаюць. Апошнімі гадамі ў скандынаўскіх кавярнях, электрычках і парках можна ўбачыць людзей, якія пахіхікваюць, пасмейваюцца, а то і шчыра рагочуць. Прычына нябачанай у тых шыротах нястрыманасці ў пачуццях — жоўтая кніжыца, сатырычны раман «Папулярная музыка з Вітулы». Тут сакавіта апісана, як нашчадкі старажытных саамаў спаборнічаюць у літрболе, а суровыя фінскія дзяды сядзяць у парылцы да перамогі. Як у забытым Богам фінскашведскім памежжы падлеткаў зачароўваюць зыкі «Беатлес» і спакуслівыя аднакласніцы.

Мікаэль Ніемі сядзіць на двух крэслах і не шманае. Яму можна, ён з памежнага гарадка Паяла: там па-шведску размаўляюць з фінскім акцэнтам, а пафінску са шведскім. Ніемі гэта ўмела эксплуатуе: цяпер, чытаючы яго кнігу, у Швецыі думаюць, што смяюцца з фінаў, а ў Фінляндыі — з грамадзянаў Швецыі.

### Проці ліха на ўзгорачку

«Мы былі нікім. І бацькі нашы былі нікім. Нашыя продкі былі пустым месцам і не мелі ніякага значэння для шведскай гісторыі...» — піша ў сваім рамане Мікаэль Ніемі.

Мікаэль Ніемі — голас безгалосых. Радыёстанцыя, што вяшчае з Паўночнага полюса. Адкінуўшы гумар і весялосць апавядання, «Папулярная музыка з Вітулы» — хутчэй «Лісты з лесу», амаль дакументальная праўда пра край несамавіты, незаможны, дзе жыхарам бракуе духу. Ніемі апісаў-апяяў непрыкметны лапік зямлі, адсталую шведскую правінцыю Турнэдален, якая ў школьным атласе надрукаваная апошняй самым дробным маштабам. І прыпячатаў: «Каб прабіцца ў людзі ў Турнэдалене, спосаб адзін — з’ехаць».

Сам жа Ніемі паехаў, каб вярнуцца. Пасля школы мігараваў на іншы бок велізарнай Швецыі, дзе пражыў 20 гадоў: працаваў электрыкам, сцэнарыстам для дзіцячых каналаў, але зрабіўся папулярным толькі тады, калі напісаў пра свой Турнэдален. Вярнуўся з раманам, каб раскатурхаць свет нататкамі пра багацце неўрадлівага. І давесці, што каштоўнасць чалавечага жыцця не ў вонкавых акалічнасцях, а ў... чымсьці іншым.

### Ніемі ў Мінску

Падчас леташніх традыцыйных беларускашведскіх сустрэч у Мінску і Пінску выступ Мікаэля Ніемі далібог адпаліў. Ён нязмушана і без ценю непрыстойнасці прачытаў са сцэны раздзел з рамана, дзе апавёў, як у заснежаных горных перавалах прас...аў сабе шлях на волю, прапяяў па-фінску застольныя песні ды непасрэдна выказаўся не толькі пра скандынаваў, але і пра беларусаў.

«Наша літаратурная сустрэча ў Мінску доўжылася амаль чатыры гадзіны, і ніхто з беларускіх гледачоў не абурыўся і не сышоў, — кажа Мікаэль. — Я, па шчырасці, вашаму такому хрысціянскаму цярпенню моцна здзіўлены. У нас у Швецыі такіх цярплівых людзей вы не сустрэнеце, асабліва на літаратурных вечарынах».

Сакрэт такой маўклівасці можа быць у тым, Мікаэле, што ваш раман для нас — вельмі своечасовая кніга.

**Павал Касцюкевіч**




Мікаэль Ніемі. «Папулярная музыка з Вітулы». — Мінск: Логвінаў (серыя «Кнігарня «Наша Ніва»), 2010. — 314 с. — 750 ас.

## «Малы і мядзведзік»




У Мінску адбылася прэзентацыя зборніка апавяданняў шведаў Юі і Томаса Віслайдэраў «Малы і Мядзведзік». Аўтары апісваюць свет захапленняў і мараў дзяцей. Кніга ўпершыню выйшла ў Швецыі ў 1990 годзе. І адразу стала папулярнай сярод дзетак. Выдаўцы спадзяюцца, што і беларускія маленькія чытачы палюбяць герояў кнігі.

За апошнія тры гады ў перакладзе на беларускую пачала стварацца бібліятэчка шведскай літаратуры. З’явіліся пераклады «Малога і Карлсана-з-даху» і «Піпі Доўгайпанчохі» Астрыд Ліндгрэн, аповесць «Маленькія тролі і вялікая паводка» Тувэ Янсан.

**КМ**

Юя і Томас Віслайдэры. «Малы і Мядзведзік»; пераклад са шведскай. — Мінск: «Літаратура і мастацтва», 2010. — 128 с.

## Сцісла

• **У Оршы на «Ляпісаў» прадалі толькі трацiну квіткоў.** Канцэрт адмянілі. У аддзеле культуры вінавацяць арганізатараў, ПУП «Шоу-канцэрт»: было мала рэкламы.

• **Гродна мае ўсе падставы атрымаць статус горада-музея.** Пра гэта паведаміў намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі. Паводле яго словаў, ініцыятыва за гарадскімі ўладамі.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

• **Летась палякі выдаткавалі на кнігі 2,86 мільярда злотых, або прыкладна мільярд даляраў.** Гэта на 1,7% менш, чым пазалетась. На першым месцы ў спісе бестселераў аказалася прададзеная ў колькасці 291,2 тыс. асобнікаў кніга Малгажаты Каліцінскай «Дом над поплавам». Выдавецтвы выпусцілі 144,4 млн асобнікаў кніг, сярэдні наклад аднаго выдання сягаў 4,6 тыс. ас. Сярэдняя цана кнігі — 32,5 злотых (12 даляраў). Цікава, што 7-я частка сагі пра Гары Потэра па-польску была прададзеная ў колькасці 4,6 млн асобнікаў.

**СМ**

## ЛіМ часткова перайшоў на расійскую

«Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі», тыднёвік «Літаратура і Мастацтва», пачаў друкаваць асобныя матэрыялы на расійскай мове. Гэтак, у першым нумары дадатку «Кніжны свет», які «ЛіМ» друкуе сумесна з Нацыянальнай кніжнай палатай Беларусі, з 12 матэрыялаў 7 — па-расійску.

Дадатак «Кніжны свет» мае знаёміць чытачоў з навінамі айчыннага друку і кнігагандлю.

«Літаратура і Мастацтва» — дзяржаўная газета, якая асвятляе культурнае жыццё краіны. У газеце ўпершыню былі апублікаваныя шмат якія творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Івана Мележа і Васіля Быкава. «ЛіМ» упершыню надрукаваў сенсацыйныя для свайго часу матэрыялы пра рэпрэсіі 1930-х, вярнуў з нябыту імёны Алеся Гаруна, Наталлі Арсенневай, Масея Сяднёва. Заснаваны яшчэ ў 1932, «ЛіМ» нават у самыя неспрыяльныя для роднага слова часіны выходзіў выключна па-беларуску.

**ЛК**

# Перадазіроўка культурай

## або Што нам рабіць са сваёй візантыйскай спадчынай?

Піша **Алег Дзярновіч**.

### Цывілізацыйная падзеленасць

У маі 1921 года ў Вільні беларускі філосаф і публіцыст Ігнат Канчэўскі, які ўзяў сабе за псеўданім імя героя аповесці Максіма Гарэцкага «Дзве душы» Ігната Абдзіраловіча, закончыў эсэ «Адвечным шляхам», якое мела падзагаловак «Даследзіны беларускага светагляду». Спецыфіку гістарычнага шляху ды праблемы культурнага развіцця беларусаў і ўкраінцаў Абдзіраловіч абазначыў праз цывілізацыйную падзеленасць: «Калі беларускі народ не стварыў выразнай культуры, дык гэта дзеля таго, што ў гістарычнай спадчыне яго была вялікая трагедыя народнага духу, якую пераэжыць выпала толькі двум-тром еўрапейскім народам: Беларусь ад X веку і да гэтай пары фактычна з'яўляецца полем змагання двух кірункаў еўрапейскай, пэўна арыйскай, культуры — заходняга і ўсходняга».



PHOTO.BYMEDIA.NET

Паводле Абдзіраловіча, дзесяцівекавое «ваганне» сведчыць пра тое, што беларусы і ўкраінцы не здолелі шчыра «далучыцца» ні да аднаго, ні да другога кірунку цывілізацыі: «Мы не зрабіліся народам Усходу, але не прынялі і культуры Заходняй Еўропы. За ўвесь час нас пачалі зваць цёмным, дзікім народам». Што стаіць за гэтымі словамі тэксту, які стаў культавым сярод беларускіх інтэлектуалаў 1980—1990-х? Гіпергістарызм з яго ўвагаю да траўмаў мінулага ці пошукі адэкватнасці?

Менш драматычнымі былі ацэнкі ўкраінскай гістарыясофіі. Класік украінскай гістарычнай навукі Міхайла Грушэўскі ў сваёй фундаментальнай працы «Гісторыя Украіны-Русі» таксама звярнуўся да вечнай праблемы народаў нашага рэгіёну — да праблемы выбару: «У першыя стагоддзі свайго гістарычнага жыцця Украіна займала сярэдняе становішча паміж уплывамі арыентальнай культуры і візантыйскай, якая, зрэшты, і сама была сплавам антычных і арыентальных элементаў». Паводле гісторыка, тое, што Русь трапіла пад культурны ўплыў не заходняга, а ўсходняга Рыма — Канстанцінопаля, было натуральным: «Візантыя была блізкай геаграфічна, а культура яе — і духоўная, і матэрыяльная — стала непараўнаўча вышэй; гэта (...) быў гарачы ясны дзень, тым часам як над Нямеччынай узыходзіла бляклая дзянніца». Прадбачыць, што заходняй культуры было прызначана расці, а візантыйскай — адставаць, тады было немагчыма, пісаў Грушэўскі. Візантыя знаходзілася ў росквіце сваёй магутнасці і славы.

Украінскі гісторык не пазбягаў і розных ацэнак «візантыйскага павароту» Русі: «Для адных паварот да Візантыі, а не да Захаду, уяўляецца вялікім выратаваннем, іншым — фатальнай [падзеяй], якая даўлела потым над усім далейшым лёсам усходнеславянскай культуры». Першы погляд, зразумела, быў уласцівы расійскім славянафілам, другі — заходнікам. І тут, працягваючы свае развагі, Грушэўскі робіць важную выснову, адыходзячы ад маніхейскага ўспрыняцця гісторыі: «Мы ж у самім гэтым павароце не бачым нічога асабліва ні выратавальнага, ні фатальнага. (...) Візантыйская культура сама па сабе была не горшай асновай для далейшага культурнага развіцця, чым культура рымска-нямецкая».

І ў тым, што ва ўсходняга славянства яна выразілася ў «візантыйшчыну», вінаватыя абставіны, якія не далі магчымасці засвоіць візантыйскую культуру ва ўсёй яе глыбіні, лічыў Грушэўскі.

### Імперыя захавальнікаў

Імператар Канстанцін Вялікі, які ўвёў хрысціянства ў якасці дзяржаўнай рэлігіі ў Рымскай імперыі, заснаваў у 324—330 гг. н. э. на еўрапейскім беразе праліва Басфор, на месцы грэцкай калоніі — горада Візанцыя, — новую сталіцу імперыі, названую Канстанцінопалем. У 395 г. Рымская імперыя падзялілася на Усходнюю і Заходнюю. У 476 г. Заходняя Рымская імперыя пад ціскам варвараў і ўласных унутраных супярэчнасцяў пала. Усходняя Рымская імперыя перажыла Заходнюю на тысячу гадоў.

Але ўладары і жыхары імперыі не называлі яе Візантыйскай. Назва «Візантыя» для абазначэння ўсёй дзяржавы была прыдумана італьянскімі гісторыкамі-гуманістамі ўжо пасля падзення Канстанцінопаля ў 1453 г. Відаць, нашчадкі Рыма імкнуліся так зняважыць былых супернікаў. Іначай навошта называць гіганцкую дзяржаву назвай грэцкай калоніі на Басфоры, на месцы якой узнік Канстанцінопаль? Дзякуючы настойлівасці і ўплыву італьянскіх аўтараў, гэта назва замацавалася ў еўрапейскай гістарыяграфіі.

Самі візантыйцы называлі сваю краіну «Рамейскай (то бок Рымскай) дзяржавай», «дзяржавай рамеяў» або проста «Раманіяй», а сябе — «рамеямі» (рымлянамі). Уладар Візантыі меў афіцыйны тытул рымскага імператара. У Заходняй Еўропе і на Русі візантыйцаў звычайна называлі грэкамі.

Візантыйскую імперыю можна назваць «імперыяй захавальнікаў». Яна нарадзілася ўжо старой, абцяжаранай грузам развітай культуры і цывілізацыі, ёй не хапала дынамізму, уласцівага многім новым «варварскім» дзяржавам. Праз візантыйцаў, як і праз арабаў, да нас дайшлі водгукі антычнай цывілізацыі. Але ж арабы не толькі захоўвалі антычную спадчыну, але і ўнеслі вялікі ўклад у развіццё многіх навук (матэматыкі, астраноміі, медыцыны), чым візантыйцы пахваліцца не могуць.

Візантыйскае мастацтва ўяўлялася застылым у строгіх кананічных формах. Хоць многія ацэнкі былі пасля перагледжаныя. Даведзены ўплыў візантыйскай культуры на зараджэнне Рэнесансу і гуманізму ў Італіі. У заходняй гістарыяграфіі з часоў Рэнесансу пераважала негатыўнае стаўленне да Візантыі, якое толькі з другой паловы XX ст. змянілася больш узважаным падыходам.

Візантыя паўстае перад намі сёння ва ўсёй красе доўгай і мудрагелістай гісторыі яе народа, ва ўсёй экзотыцы яе формаў і бляску яе скарбаў. Але за багаццем упрыгожанняў, за урачыстасцю афіцыйных, свецкіх, духоўных або вайсковых тэкстаў праніклівы даследчык зможа знайсці тлумачэнне ўпэўненасці, сумненняў і фантазій аднаго з самых сур'ёзных народаў свету.

### Ці існуе патэнцыял візантыйскай спадчыны?

Тут мы павінны зноў звярнуцца да праблемы цывілізацыі, якая хвалявала многіх мысляроў. Можна сцвярджаць, што візантыйская цывілізацыя аднаўляе сябе і пасля гібелі Візантыйскай дзяржавы. Адбываецца гэта, дзякуючы геакультурнаму выбару народаў, якія некалі засвоілі найважнейшыя рысы візантыйскай цывілізацыі.

Частка даследчыкаў вылучае асаблівую праваслаўную цывілізацыю, цэнтр якой на сённяшні дзень знаходзіцца ў Расіі. Гэтая цывілізацыя адрозная ад заходняга хрысціянства па прычыне сваіх візантыйскіх каранёў, амаль трох стагоддзяў мангольскага прыгнёту, бюракратычнага дэспатызму і абмежаванага ўплыву на яе Адраджэння, Рэфармацыі, Асветніцтва, якія мелі месца на Захадзе.

Супастаўляючы цывілізацыйныя асаблівасці Візантыі і Захаду, не варта ацэньваць тую ці іншую цывілізацыю як больш ці менш прагрэсіўную. Але, паводле крытэрыяў цывілізацыі, створаных у Новы час на еўрапейскім Захадзе, візантыйскі традыцыяналізм, звязаны з адмовай ад стварэння новых сацыяльных інстытутаў і нежаданнем істотных зменаў у палітыка-прававой думцы, не спрыяў прагрэсу.

На Захадзе пачаткі дэмакратыі і канстытуцыйнай дзяржавы ўзыходзяць да ранняга Сярэднявечча. Так, расійскі гісторык Арон Гурэвіч паказаў, што роля вольнага насельніцтва на сярэднявечным Захадзе і ўласцівых яму формаў менталітэту і ментальнасці была значна большай, чым гэта прынята лічыць. Гурэвіч перасоўвае «дату нараджэння» еўрапейскага індывіда значна ўглыб Сярэднявечча.

Візантыйскае ж грамадства адрознівалася непараўнальна большым традыцыяналізмам. На працягу стагоддзяў мы не назіраем узнікнення новых сацыяльных інстытутаў маштабаў, падобных да заходніх, роўна як і істотных зменаў у правасвядомасці і палітыка-прававой думцы. Візантыя заставалася на працягу ўсёй сваёй гісторыі традыцыйнай дзяржавай, палітычная эліта якой асцерагалася пераменаў. Але адначасова, маючы ў сваім арсенале развітую светапоглядную і палітыка-прававую дактрыну, гэтая эліта здолела ў складаных умовах знешняй пагрозы, якая пастаянна нарастала, захаваць высокую духоўную культуру і палітычныя традыцыі, якія перажылі эпоху дзяржаўнай незалежнасці імперыі.

Пасля супастаўнага аналізу заходняй і ўсходняй традыцыі можна зрабіць выснову адносна перспектыў гэтага рэгіёна. Калі поствізантыйскія традыцыі, адчуванне прыналежнасці да кола ўсходнехрысціянскай цывілізацыі мае якую-небудзь рэальную каштоўнасць для гэтых культур, то пазітыўны патэнцыял гэтай спадчыны можа быць рэалізаваны толькі ў рамках сучаснага грамадства.

Дэмакратычная палітычная сістэма агаляе, часам вельмі жорстка, светапоглядныя і маральныя праблемы грамадства. Сістэма прававой дзяржавы, у вытоках сваіх заснаваная на рымскім праве, стрымлівае супярэчнасці паміж людзьмі. І ў такой сітуацыі досвед візантыйскага пошуку гармоніі можа спрыяць гарманізацыі адносін паміж чалавекам, грамадствам і дзяржавай. У адваротным выпадку перадазіроўка грузам традыцыйнай культуры здольная прывесці да адсутнасці дынамізму і, як вынік, да чарговага цывілізацыйнага спаборніцтва на апярэджанне.

# Маніфест Тутэйшага, або Кантынент душы

*Ваганне паміж Захадам і Усходам і шчырая непрыхільнасць ні да аднаго, ні да другога з'яўляецца асноўнаю адзнакаю гісторыі беларускага народа.*
***Ігнат Абдзіраловіч, «Адвечным шляхам»***

*Беларусь павінная стаць мостам, які звязвае Усход і Захад.*
***Аляксандр Лукашэнка, з паслання да народа 23.04.2009***

*Усе нашы чаканні вызначае геаграфія. Рэспубліка Беларусь знаходзіцца паміж двума цэнтрамі ўплыву — Еўрасаюзам і Расіяй.*
***Сяргей Мартынаў у інтэрв'ю венскаму выданню Der Standard***

*Гэта «між» залезла ў косці,*
*Пакуляла ўсё ўверх дном.*
*Правяць баль у хаце госці,*
*Гаспадар жа — пад сталом.*

***Сяргей Законнікаў, «Між Варшавай і Масквой»***

***

Каб быць ПАМІЖ, трэба спачатку БЫЦЬ. Бытаванне ПАМІЖ шкодзіць самому БЫЦЦЮ, пазбаўляючы яго паўнаты. ПАМІЖнасць — гэта памежнасць, перыферыйнае існаванне і мысленне.

МОСТ — гэта месца транзіту, а не бытавання. На ім не спыняюцца, па ім толькі рухаюцца да іншага берага.

Ёсць геаграфія прасторы і геаграфія душы. У геаграфіі душы няма ПАМІЖнасці, няма МАСТОЎ, уся духоўная прастора запоўненая ТУТнасцю. Сутнасць ТУТнасці — у цэнтрызме мыслення. Цэнтрычнае мысленне накіроўвае думку і пачуцці на БЕЛАРУСЬ, а не на ПАМІЖнасць і не на МОСТ. Я, ТУТны беларус, не хачу быць на ПАМІЖным МОСЦЕ. Хачу быць ТУТ — на духоўным КАНТЫНЕНЦЕ, сучаснае імя якому — БЕЛАРУСЬ.

Розум без пачуцця — непаўнавартасны. ТУТнасць завастрае адказнасць за долю Бацькаўшчыны, узбуджае творчую думку, працуе на будучыню праз наданне паўнавартаснасці гістарычнай рэтраспектыве, замацоўвае адчуванне прысутнасці. [Антытэза «адсутнасці», пра якую піша Валянцін Акудовіч у кнізе «Код адстунасці».]

ТУТ — гэта зямля і жыццёвы лад, у якім жылі мае продкі. ТУТ — гэта мова, якую яны тварылі і якой я карыстаюся. ТУТ — гэта мае мастацкія каштоўнасці і эстэтычныя густы. ТУТ — гэта магілы продкаў, што лучаць мяне з народам. Пакуль жыву, буду ТУТнічаць, буду памятаць, што кожная мясціна ў геаграфіі народнай душы — гэта мой быццёвы цэнтр.

На кантыненце душы — мой пачатак і працяг. На ім — мае творчыя вытокі і імпульсы. На ім усе формы, колеры, узоры, якімі ўзбагачу суродзічаў і якія пакіну ў вянку сусветнай духоўнасці.

Беларуская душа вымяраецца не наваколлем з мастамі, а сукупнасцю ТУТных жыццяў, што папярэдзілі маё існаванне. Народ — біялягічна-сацыяльная рэальнасць, якая, мяняючы формы, захоўвае гістарычную цягласць. У якой бы ладавай структуры ні бытавалі мае продкі, я неразлучна спалучаны з імі. Я — акумулятар іх быццёвай і творчай энергіі. Я, ТУТны беларус, — біялагічны і духоўны спадчыннік стагоддзяў, сувязны мінуўшчыны і будучыні.

Новыя формы жыцця ствараюцца на духоўнай глебе, апрацаванай продкамі. Зменлівасць гістарычнага бытавання не мяняла іх ТУТнасці, іх сувязі з зямлёй, на якой яны жылі, якую любілі і баранілі, якая перайшла мне ў спадчыну і якую я маральна абавязаны перадаць нашчадкам.

Культурныя элементы, перанятыя з іншых духоўных кантынентаў, у моц іх прыняцця, становяцца кампанентамі маёй культуры, арганічнай часткай маёй ТУТнасці. У век глабалізацыі не ўцячэш ад вонкавага свету. «Беларуская хвароба» — уцяканне — праз МОСТ — ад сябе саміх. Маё ж месца ТУТ, на кантыненце Беларускай душы, на камені прашчурнай спадчыны.

**Янка Запруднік**



# Восем перавагаў ранішняга сэксу

У Англіі ранішнімі любошчамі бавяцца да 5% насельніцтва, у Нямеччыне і Францыі аматараў кахацца перад працоўным днём — 7%, у Італіі — 9, але больш за 10 адсоткаў не дае ніводная еўрапейская краіна. Толькі што выціснуты апельсінавы сок і хвацкая яечня? Вядома, добрыя рэчы, але між тым сэксолагі сцвярджаюць, што і сэкс уранку — дужа карысны занятак.

Ніжэй мы падаем восем перавагаў ранішніх любошчаў: вядома, не варта прымаць іх як безапеляцыйныя довады «за», але задумацца варта.

1. Сэкс ранкам — выдатная зарадка.

Падчас пешчаў задзейнічаныя ці не ўсе групы цягліц чалавечага арганізма. Сэкс-гімнастыка простая для засваення — гэта ўмее кожны!

2. Выдатны масаж для ўнутраных органаў перад доўгім днём.

Палепшыць зварот крыві, актывізаваць дыханне — добры пачатак дня для вашых сасудаў. Рызыка сардэчных захворванняў падае, залагоджваюцца мігрэні.

3. Навукоўцы давялі, што жанчыны, якія аддаюць перавагу ранішняму сэксу, радзей пакутуюць на дэпрэсію, а мужчыны — менш падпадаюць стрэсам.

4. Гарманальны плюс. Тэстастэрон у крыві мужчыны ў прамежку ад сёмай да восьмай ранку сягае свайго піку.

5. Восьмая ранку — найлепшая пара для сэксуальных адносінаў, паколькі арганізмы абодвух партнёраў літаральна «напампаваныя» энергіяй. Другі такі пік імпэту наступіць няхутка — ажно а 20-й вечара.

6. Ранішні сэкс наладоўвае бадзёрасцю на цэлы дзень, сакрэт якой у выпрацаваных эндарфінах.

7. Ранішні сэкс пакідае станоўчыя згадкі на цэлы дзень, што дазваляе быць у гуморы (нават калі над вамі цэлы дзень крукам згінаецца начальнік).

8. Ранішні сэкс — дарога да насычанага палавага жыцця партнёраў.

P.S. 9. Весялей прачынацца дзеля сэксу, чым дзеля таго, каб ісці на працу.

**ЛК**



# Канец «Фенікса»

**Страчана сувязь з лабараторыяй коштам $475 млн, высланай на Марс.**

Безвынікова завершылася пошукавая экспедыцыя, што мусіла ўсталяваць сувязь з навуковай лабараторыяй «Фенікс» на Марсе. Навукоўцы НАСА канстатавалі, што станцыя страчаная назаўжды.

Пра гэта паведамілі ў лабараторыі рэактыўнага руху (Пасадэна, Каліфорнія), якая кантралюе апараты на Марсе.

— «Фенікс» вельмі дапамог у даследаваннях і працаваў даўжэй за меркаваны тэрмін эксплуатацыі, — паведаміў супрацоўнік лабараторыі Фок Лі.

Кантакт з «Феніксам» перарваўся ў лістападзе 2008 года, пасля пылавай буры на Марсе. У студзені, лютым і красавіку гэтага года НАСА беспаспяхова спрабавала аднавіць сувязь з лабараторыяй.

Мяркуецца, што «Фенікс» спаралізавалі суровыя марсіянскія зімы. На здымках, зробленых на станцыі Марс-Адысей, бачныя змены ў размяшчэнні ценю ад апарата ў параўнанні з перыядам яго актыўнай дзейнасці. Эксперты НАСА прыйшлі да высновы, што гэта паказвае на ўтварэнне тоўстага пласта лёду на панэлі сонечных батарэяў. Мяркуючы па ўсім, лёд пашкодзіў або разбурыў панэлі.

«Фенікс» здзейсніў пасадку на Чырвоную планету 25 мая 2008. Замест трох месяцаў, якія каштавалі $475 млн, ён прапрацаваў пяць. «Фенікс» перадаў на Зямлю каля 25 тысяч здымкаў. З яго дапамогай былі знойдзеныя два мінералы, якія даказваюць, што ў мінулым на Марсе была вада.

**КаМ**

## У Нью-Ёрку — нашэсце клапоў

У Нью-Ёрку эпідэмія клапоў выклікала паніку.

З 2001 года колькасць заражэнняў паразітамі павялічылася на 71%. Так, у 2004 годзе паступіла ўсяго 537 скаргаў на паразітаў і 82 выпадкі заражэння людзей.

У 2009 гэтыя лічбы ўзраслі да 10 тысяч 985 скаргаў і 4 тысяч 84 выпадкаў заражэння.

«Праблема паўсюль, і яна расце з-за невядомасці, бо людзі нам нічога не паведамляюць праз сарамлівасць, — заявіў інспектар кампаніі па знішчэнні паразітаў. — Людзі занадта прысаромленыя, каб нешта расказваць. Калі яны прызнаюцца, што ў іх ёсць клапы, яны баяцца, што страцяць сваё жыллё, абоім забароняць хадзіць на працу, ці што прыйдзецца выкінуць мэблю і рэчы».

Для знаходжання паразітаў кампаніі выкарыстоўваюць спецыяльна навучаных сабак.

**АГ**

# З канвеера Hummer сышоў апошні аўтамабіль

З канвеера завода General Motors у амерыканскім Шрыўпорце (штат Луізіяна) сышоў апошні пазадарожнік маркі Hummer. Пасля спынення вытворчасці аўтамабіляў Hummer прадпрыемства працягне выпуск Chevrolet Colorado і GMC Canyon.



У лютым канцэрн General Motors абвясціў аб паступовым згортванні вытворчасці аўтамабіляў Hummer пасля зрыву ўгоды па продажы стратнага брэнда кітайскаму аўтаканцэрну Sichuan Tengzhong. Пагадненне аб продажы Hummer было падпісанае ў кастрычніку 2009 года. Угода ацэньвалася ў 150 млн даляраў. Паводле яе ўмоваў, Sichuan Tengzhong набываў брэнд і ліцэнзіі на вытворчасць аўтамабіляў і прымаў абавязальніцтвы па дамовах з дылерамі Hummer, а таксама мог некаторы час карыстацца магутнасцямі амерыканскіх заводаў GM для вытворчасці машын гэтай маркі. Але пагадненне паміж GM і Sichuan Tengzhong не адбылося — яго не ўхваліў кітайскі ўрад.

**naviny.by**



## «Вянок Януковіча» прадалі за $5,5 тысяч

**Вянок вынеслі з-пад помніка Невядомаму салдату.**

У штаб-кватэры ўкраінскай партыі «Брацтва» скончыўся інтэрнэт-аўкцыён па продажу вянка, які ўпаў на галаву Віктара Януковіча.

Легендарны вянок набылі за 42 тысячы грыўняў, гэта $5,5 тысяч. У таргах узялі ўдзел 15 чалавек.

**Яўген Васількоў**

## Мэрам Рэйк'явіка стаў комік, які паабяцаў не выконваць абяцанні

**Ён лідэр Найлепшай партыі, якая адкрыта прыкалваецца з традыцыйных партый.**

На выбарах у муніцыпальную раду сталіцы Ісландыі Рэйк'явік атрымала перамогу Найлепшая партыя, лідэрам якой з'яўляецца комік Ён Гнар. Партыя атрымала падтрымку 34,7% выбаршчыкаў, што дазволіла Гнару стаць мэрам сталіцы.

Найлепшая партыя, заснаваная паўгода таму, пазіцыянуе сябе як «адкрыта карумпаваная» і абяцае не выконваць сваіх перадвыбарчых абяцанняў.

На выбарах партыя гарантавала выбаршчыкам бясплатныя ручнікі ў басейнах, белага мядзведзя ў заапарку, Дыснэйлэнд у аэрапорце Рэйк'явіка, а таксама «чысткі ў палітыцы».

Другое месца атрымала Незалежніцкая партыя — адной з самых даўніх палітычных арганізацый у краіне аддалі сваю перавагу 33,6% галасоў. Трэцяе месца з 19,1% галасоў заняў Сацыял-дэмакратычны альянс, які валодае большасцю ў ісландскім парламенце.

Па выніках выбараў, Найлепшая партыя зойме ў муніцыпальнай радзе Рэйк'явіка шэсць месцаў з 15, Незалежнай партыі дасталіся пяць крэслаў. Сацыял-дэмакраты атрымалі тры месцы, яшчэ адзін дэпутат будзе прадстаўляць рух зялёных. Выбары адбыліся ў суботу, 29 мая.

**gazeta.ua**

# Playboy пераходзіць у фармат 3D

Часопіс Playboy адважыўся на рэвалюцыю. Новы чэрвеньскі нумар амерыканскага выдання выйдзе ў трохмерным варыянце. «Абёмная» мадэль на развароце будзе як бы прапаноўваць чытачу бакал віна.

Да часопіса будуць прыкладзеныя стэрэаакуляры, так што ў чытачоў створыцца эфект прысутнасці побач з голымі мадэлямі.

Першай дзяўчынай Playboy, якую чытачы ўбачаць у 3D фармаце, стане амерыканская красуня Хоўп Дваражык, узнагароджаная тытулам дзяўчыны Playboy 2010 года.

Стваральнікі часопіса маюць намер даказаць, што, нягледзячы на бурнае развіццё інтэрнэту, папулярныя часопісы не сыдуць у мінулае, таму што «трымаць часопіс у руках вельмі прыемна», а новыя тэхналогіі робяць ранейшае задавальненне яшчэ больш захапляльным. Новаўвядзенне адрасаванае ў першую чаргу маладым людзям, якія з'яўляюцца актыўнымі прыхільнікамі новых тэхналогій. «У кніг і часопісаў відавочная перавага перад выявамі на маніторы кампутара.



Вы па-ранейшаму можаце схаваць часопіс пад матрацам, як гэта рабіў ваш бацька», — сцвярджаюць стваральнікі часопіса.

Чэрвеньскі выпуск будзе цікавы «тым чытачам, якія раней маглі толькі марыць аб тым, каб аголеная дзяўчына з разварота часопіса выскоквала б да іх насустрач», дадаюць стваральнікі выдання.

Playboy зараз перажывае не найлепшыя часы: праз націск бясплатнай сеткавай эротыкі ў перыяд ад 2002 да 2008 года часопіс страціў 600 тысяч чытачоў. Калі ў 2006 годзе наклад часопіса складаў 3,5 млн асобнікаў, то цяпер — толькі 1,5 млн.

**ЯВ**




# Грамабоец Зеўс супраць Неверагоднага Халка

**Выява Афрадыты, якая паступова перацякае ў Ксенію Сабчак, Апалон, скрыжаваны з Гары Потэрам… У «Галерэі Ў» пачалася выстава Аляксандра Некрашэвіча «Багі і героі».**


ВІКА ШЧАРБАКОВА

«Багі і героі» — серыя жывапісу, выкананая ў тэхніцы аэраграфіі на алюмініі і пакрытая аўтамабільным лакам. Выявы вобразаў класічнага жывапісу і новых медыя-багоў, сумяшчэнне класічнага вобраза з сучасным. За цяперашнім часам куміры шоў-бізнесу ўзводзяцца ў ранг сучасных багоў, а вобразы мінулага дэвальвуюцца ад бясконцай колькасці ідалаў новага часу. За гэтым працэсам і сочыць Аляксандр Некрашэвіч.

«Проста цікава і плённа было паназіраць, як масавая свядомасць пераўтварае класічную міфалогію ў сучасную і як класічныя багі трансфармуюцца ў сучасных медыйных персанажаў, — кажа Аляксандр Некрашэвіч. — Я раблю сінтэз класічнага мастацтва з сучаснай міфалогіяй, складзенай з кінастужак, коміксаў».

На думку куратара праекта мастацтвазнаўцы Ірыны Саламацінай, цяпер час «масавага капіявання твора».

«Са з'яўленнем сродкаў капіявання каштоўныя карціны — высокія ўзоры мастацтва — былі масава растыражаваныя, дзякуючы чаму адбылася дэмакратызацыя грамадства, — заяўляе Саламаціна. — Цяпер Мона Ліза і Геракл, гэтаксама як Бэтмэн і Мадонна, могуць на аднолькавых правах вісець у кожным памяшканні».

Сам **Аляксандр Некрашэвіч (на фота)** (нарадзіўся ў вёсцы Бобрык на Берасцейшчыне ў 1973 годзе), які працаваў у цюнінгу, мастацкай расфарбоўцы машын, матацыклаў і нават прыватнага рэактыўнага самалёта Л-29, знаходзіцца ў самым цэнтры такога капіявання класічных твораў — яму назіраць за працэсам зліцця высокага і прыкладнога мастацтва лягчэй.

«Наколькі ў заможных людзей, якія хочуць вылучыцца пры дапамозе афарбоўкі машыны, моцны поцяг да капіявання класічных карцін: Мона Лізы ці працаў мастакоў эпохі Адраджэння, — дадае Ірына Саламаціна. — Цяпер ужо ў мастацкіх працах Некрашэвіч абгульвае гэтае выкарыстанне высокага мастацтва ў масавай культуры, гэтае спалучэнне неспалучальнага».

Цытуючы класічныя творы Бацічэлі, Леанарда Да Вінчы, Некрашэвіч не распрацоўвае новыя выявы, але падкрэслівае свае асаблівыя стасункі з класічным мастацтвам і праз камбінацыю з масавай культурай дае дакрануцца да гэтага свету гледачу.

**ЛК**

## КАНЦЭРТЫ

### Recha

**9 чэрвеня** Recha дае сольны канцэрт **у кавярні-клубе «Лісіная нара» (вул.Каліноўскага, 32)**. Вас чакае абноўлены склад (цяпер са смакам акардэона!) і вясёлыя песні пра жыццё ды каханне. **Пачатак а 19-й.**

### Беларускія рок-музыкі ў Маскве

**5 чэрвеня ў клубе Mezzo Forte (М. ВДНХ, 1-я Астанкінская, 53, Масква)** пройдзе фэст «Сіні пашпарт». Першы вялікі канцэрт новага праекта Рамана Арлова (экс–J–Морс). **Пачатак а 20-й.**

### Нагуаль

**30 траўня а 19-й у «Графіці»** — «Нагуаль».

### Разбітае сэрца пацана

**3 чэрвеня а 19-й у «Графіці»** — «Разбітае сэрца пацана».

### Рок за Баброў

**5 чэрвеня а 15-й у Сілічах** — «Рок за Баброў». Бяруць удзел **«Без білета»**, **«Градусы»** і **«Воплі Відоплясова»**. Уваход вольны.

## ІМПРЭЗЫ



### Андрэй Катлярчук

Андрэй Катлярчук наведае беларускія гарады, каб прадставіць чытачам свае кнігі «Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў» і «У цені Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швецыя ў часе еўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст.». **1 чэрвеня а 16.00** прэзентацыя з удзелам аўтара адбудзецца **ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі (пр. Незалежнасці, 116)**. **2 чэрвеня а 18.00** ён спаткаецца з чытачамі **ў Магілёве (Гарадская бібліятэка, вул.Першамайская, 30)**. **3 чэрвеня а 17.00** ён запрашае на сустрэчу **ў Гомелі (вул.Палеская 52)**. **4 чэрвеня а 19.30** з аўтарам можна будзе сустрэцца **ў Баранавічах (вул. Міцкевіча, 65)**. Запрашаюцца ўсе ахвочыя. Даведкі праз т.: (029) 550–79–69.

## ВЫСТАВЫ

### Біясфера-2010

**Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 5 чэрвеня** запрашае наведаць выставу «Бясфера–2010». «Біясфера–2010» — гэта праект, які адбываецца ў рамках Міжнароднага года біялагічнай разнастайнасці. У праекце бяруць удзел маладыя мастакі і прызнаныя майстры візуальнага і дэкаратыўнага мастацтва: Вадзім Качан, Марына Бацюкова, Аляксандр Дзямідаў, Васілі Зянько ды іншыя.

### Святло стагоддзяў

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 13)** экспануецца літаратурна–мастацкая выстава «Святло стагоддзяў», прымеркаваная да юбілейных дат асветнікаў зямлі беларускай — Кірылы Тураўскага, Міколы Гусоўскага, Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага.

### Веснавая мелодыя

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 28 чэрвеня** працуе выстава «Веснавая мелодыя» ізраільскай мастачкі Малкі Цэнцыпер. Малка Цэнцыпер працуе ў розных жанрах і матэрыялах, віртуозна спалучае рэальнасць і абстракцыю.

## ТЭАТРЫ

**3 чэрвеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр оперы і балета** — «Хаваншчына»

**4 чэрвеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»

**5 чэрвеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»

**6 чэрвеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»
**Тэатр оперы і балета** — «Травіята»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»

**7 чэрвеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў княства Сноў»
**Тэатр оперы і балета** — «Спячая прыгажуня»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»

**8 чэрвеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармен»
**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Дзікае паляванне караля Стаха»

**9 чэрвеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Тэатр імя Горкага** — «Я веру ў гараскопы»
**Тэатр оперы і балета** — «Жарсці (Рагнеда)»

**10 чэрвеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»

## КІНО

### У маніторы прынц глядзеўся лепей

**Прынц Персіі: Пяскі часу**
ЗША, 2010, каляровы, 116 хв.
**Рэжысёр:** Майк Ньюэл
**Жанр:** Прыгоды мяча і магіі паводле аднайменнай відэагульні
**Адзнака:** 4,5 (з 10)




Усыноўлены каралём прынц Дастын набывае ў захопленым горадзе магічны кінжал, здольны паварочваць час. Але за кінжалам і самім прынцам палююць забойцы, якія мараць авалодаць усім светам. Герой разам з прынцэсай Тамінай мусіць перахітрыць лёс.

Карціна Майка Ньюэла — экранізацыя папулярнай аркаднай камп'ютарнай гульні. Фірмовыя трукі гульні — акрабатычныя скокі — напоўніцу захаваныя ў фільме. Дададзеныя спецэфекты: шкляна–пясчаныя буры, драпежныя змеі і вогненныя катастрофы.

Касцюмная раскоша магічнага Усходу цешыць вока, лётаюць мячы, стрэлы і дроцікі.

Маецца нават і нескладаны сюжэт, што для экранізацыі гульні — заўжды галаўны боль.

Прадзюсар стужкі Джэры Бруктеймер яўна хацеў паўтарыць поспех «Піратаў Карыбскага мора». Але прыгодаў прынца замала, каб Джыленгал, Кінгслі і камічны Альфрэд Маліна паспелі напоўніцу праявіць свае здольнасці. Прыгодніцкія атракцыёны багатыя і відовішчныя, але сціплыя трукі з гульні выглядалі жывей.

**Андрэй Расінскі**

# У закладніках у «Аднакласнікаў»

**Зарэгістравацца ў сацыяльный сетцы проста, а вось выдаліць інфармацыю пра сябе робіцца ўсё складаней.**

Дэпрэсія, нежаданне бачыць і чуць знаёмых і імкненне выдаліць сваю старонку ў сацыяльных сетках, каб застацца ў адзіноце, — сітуацыя, з якой сутыкаліся многія карыстальнікі інтэрнэту. І толькі тады яны разумелі, што зрабіць гэта не так і проста, як здаецца на першы погляд. Сайты ахоўваюць інфармацыю пра карыстальнікаў ад іх саміх! У першую чаргу гэта зроблена з уяўным клопатам пра людзей — маўляў, праз дзень адумаецца, а аднавіць ужо не зможа. Прыхільнікі тэорыі сусветных змоў бачаць іншае тлумачэнне — карпарацыі хочуць трымаць пад каўпаком мільёны карыстальнікаў. У правілах карыстання сайтамі, з якімі, звычайна ўсляпую, згаджаюцца інтэрнэтчыкі, ёсць ускоснае пацверджанне.

Напрыклад, карыстальнікі сеткі «Вконтакте» абавязуюцца «прадастаўляць поўныя і праўдзівыя дадзеныя і сачыць за іх актуалізацыяй». Хто зможа незаконна прачытаць гэтыя звесткі — адкрытае пытанне. Нядаўна свет шакавала апублікаваная перапіска стваральніка сеткі Facebook Марка Цукерберга са знаёмым. «Калі табе патрэбна інфармацыя пра кагосьці з Гарварда, толькі папрасі. У мяне 4000 е-мэйлаў, фатаграфій, адрасоў». — «Адкуль яны ў цябе?» — «Гэтыя тупені выкладаюць іх самі».

Калі хваля эйфарыі ад карыстання сацыяльнымі сеткамі прайшла, людзі захацелі выйсці са шматмільённай «секты». Фраза «выдаліць акаўнт» на днях увайшла у топ-10 запытаў у пошукавіку Google. І зразумелі, што назад іх ніхто не пусціць... Большасць сацыяльных сетак у свеце практыкуе два крокі для знікнення карыстальніка — дэактывацыю профілю і поўнае выдаленне дадзеных. Напрыклад, карыстальнікі Facebook могуць націсканнем адной кнопкі схаваць свой профіль ад усіх астатніх, а для таго, каб знішчыць інфармацыю цалкам, адправіць праз некаторы час просьбу-запыт адміністратарам, тлумачыць сэрвісная служба кампаніі. Такая магчымасць была дададзеная пасля шматлікіх скаргаў абураных карыстальнікаў. Ніхто не можа прасачыць, ці насамрэч інфармацыя будзе выдаленая з сервераў сайта.

Тая ж сітуацыя і з «Вконтакте». Двухкрокавая сістэма выдалення як быццам бы прыводзіць да знішчэння інфармацыі, але ідэнтыфікацыйны нумар карыстальніка назаўсёды застаецца незанятым.




Зарэгістраваныя на «Аднакласніках» сталі скардзіцца, што са старонкі настроек знікла кнопка «выдаліць профіль». Таму для знішчэння інфармацыі трэба адправіць электронны ліст адміністратарам і дачакацца ад іх адказу. Прычым не факт, што яны не запатрабуюць адсканаваную копію пашпарта... Згадзіцеся, працэдура досыць доўгая і шмат хто кіне яе на паўшляху.

Але нават калі аперацыя па выдаленні пасяхова скончылася, радавацца рана. Інфармацыя застаецца і ў так званых кэшах пошукавых сістэм. Практычна ўсе пошукавікі захоўваюць копіі старонак, да якіх можна атрымаць доступ з дапамогай спасылкі «захаванне старонкі». Гэтыя кэшы абнаўляюцца даволі доўга, таму не варта здзіўляцца, калі пасля выдалення профілю з сацыяльнай сеткі вас яшчэ будуць знаходзіць праз яе — звычайна гэта займае паўгода—год.

**Яўген Васількоў**



ЗДАРОЎЕ

## Сэрца ў шакаладзе

Нават адна «долька» шакаладу ў дзень можа знізіць крывяны ціск і зменшыць рызыку ўзнікнення сардэчных захворванняў.

Гэты факт выявілі нямецкія навукоўцы, якія прааналізавалі ўплыў ужывання шакаладу на здароўе 19 357 чалавек ва ўзросце ад 35 да 65 гадоў.

У тых, хто спажывае ў сярэднім 7,5 грама шакаладу ў суткі, больш нізкі крывяны ціск, а рызыка інфаркту ці інсульту — на 39% меншая, чым у тых, хто еў у сярэднім найменшую колькасць шакаладу сярод паддоследных — 1,7 грама ў дзень.

7,5 грама прыблізна адпавядае адной «дольцы» стандартнай 100-грамавай шакаладкі.

Пры гэтым злоўжываць шакаладам нельга. Толькі невялікая колькасць шакаладу замест іншых высокакаларыйных прадуктаў харчавання можа дапамагчы перадухіліць сардэчныя хваробы, таму што трэба трымаць вагу свайго цела стабільнай.

Навукоўцы мяркуюць, што найбольш карысным з'яўляецца цёмны шакалад, бо ў ім утрымліваецца больш какавабабоў.

ВЕРСІІ

## Іншапланетнікаў людзі сняць?

Расійскі палітык, прэзідэнт Калмыкіі Кірсан Ілюмжынаў, шакаваў гледачоў Першага тэлеканала Расіі заявай, што яго забіралі гуманоіды і ён вандраваў з імі ў лятучай талерцы па космасе. Яго сведчанні былі падобныя да сведчанняў многіх іншых «кантакцёраў», якія расказвалі, што прадстаўнікі пазазямной цывілізацыі з'явіліся ўначы, проста з акна, замест якога раптам адчыніўся калідор у іншае вымярэнне.

Марк Маховальд, прафесар Цэнтра расстройстваў сну ў Мінеапалісе, падазрае: відзежы кантакцёраў — гэта разнавіднасць сну. Канкрэтна — наркалепсія: парушэнне адной з яго фазаў, так званага «хуткага сну», які суправаджаюць хуткія рухі вачэй.

Мозг пры такім стане часткова не спіць, а часткова пагружаны ў фазу «хуткага сну». І можа прадукаваць надзвычай рэалістычныя відзежы.

Прафесар Крыс Фрэнч, які ўзначальвае аддзяленне псіхалогіі ў Лонданскім універсітэце, абследаваў 19 чалавек, якія сцвярджалі, што сустракаліся з прыхаднямі. І знайшоў: усе яны шчыра верылі ў НЛА, па-другое, у той ці іншай ступені пакутавалі на наркалепсію.

— Як правіла, — кажа прафесар Фрэнч, — пры гэтым сціскае грудзі, робіцца цяжка дыхаць. А іншапланетнікі з'яўляюцца з уласных успамінаў і фантазій. Людзі нагледзяцца на прыхадняў у кіно, на малюнках, а потым яны з'яўляюцца ўжо ў галюцынацыях, мудрагеліста аформленых аддзеламі мозгу, якія актыўна працуюць падчас «хуткага сну».

Нібы ілюструючы словы прафесара, Ілюмжынаў расказваў: «...Мы зайшлі на касмічны карабель, і паветра, кіслароду стала мала. Мне таксама далі скафандр, і я не паспеў падумаць, што паветра не хапае, а таварыш — я не ведаю, як яго назваць, — іншапланетнік паказаў на грудзі: тут вось крыху пакруці, ну, адрэгулюй кісларод. Адрэгуляваў... Памятаю, што прасіў вярнуць мяне хутчэй на Зямлю. Чаму? Таму што праз два дні я мусіў праводзіць Тыдзень моладзевага самакіравання ў Калмыкіі...»



**Так выглядалі прадстаўнікі пазазямной цывілізацыі ў вядомым фільме «Кін-дза-дза».**

ЖЫВАЯ ПРЫРОДА

## Камары лятуць на пот

Знайсці «крыніцу харчавання» крывасосным камарам дапамагае не выдыханы чалавекам і птушкамі вуглякіслы газ і не цеплавое выпраменьванне, як лічылася раней. Нейроны нюхальных рэцэптараў гэтых насякомых рэагуюць на асаблівае пахучае рэчыва — аліфатычны альдэгід нонаналь.

Камары — гэта не толькі крыніца непрыемнага піску ў пакоі і балючых укусаў, але і пераносчыкі небяспечных захворванняў — малярыі, жоўтай ліхаманкі, дэнге і некаторых энцэфалітаў. Адна толькі малярыя з'яўляецца прычынай смерці прыкладна двух мільёнаў чалавек штогод.



Лічыцца, што падчас выбару ахвяры самкі камара (самцы маюць недаразвітыя сківіцы і ўвогуле не кусаюцца) арыентуецца на вуглякіслы газ, выдыханы чалавекам, на цеплавое выпраменьванне, а таксама на пах малочнай кіслаты, якая маецца ў поце. Таксама самка камара рэагуе на святло, аддаючы перавагу асветленым памяшканням.

Амерыканскія энтамолагі правялі комплекснае даследаванне рэакцыі камароў на рэчывы, якія выдзяляюцца людзьмі.

Яны правялі выпрабаванне на групе з 16 добраахвотнікаў — мужчын і жанчын рознага веку, прадстаўнікоў розных расаў і этнічных групаў. З дапамогай цвердафазавай мікраэкстракцыі былі вылучаныя пахучыя рэчывы, з якіх «складаецца» пах чалавека. Пасля гэтага самка камара была замацаваная на лабараторнай піпетцы так, што свабоднымі заставаліся толькі яе вочы і вусікі. Да іх былі падведзеныя электроды, якія рэгістравалі іх актыўнасць. Затым па чарзе ацэньвалася рэакцыя жамяры на духмяныя рэчывы, што выдзяляе чалавек.

Самую актыўную рэакцыю ў жамяры выклікае нонаналь, які ўтрымліваецца ў поце чалавека.

Менавіта ён дасылае камару «паведамленне» аб наяўнасці ежы. Вусікі жамяры працуюць такім чынам, што ловяць нават самыя нізкія канцэнтрацыі нонаналю.

**Падрыхтавала КаМ**

Сапраўдная беларуская кухня

## Фасоля спаржавая з вяршкамі

800 г спаржавай фасолі, 1 лыжка масла, трохі цукру, 1 лыжка мукі, 1 шклянка вяршкоў, соль, зеляніна пятрушкі.

Маладыя зялёныя стручкі спаржавай фасолі ачысціць ад грубых валокнаў, прамыць, парэзаць наўскось на кавалачкі, зварыць у падсоленай вадзе і адцадзіць. Добрую лыжку масла падсмажыць з мукой і дадаць да фасолі, пасаліць па смаку, уліць вяршкі, дадаць цукру і тушыць да належнай густаты. Калі хочаце атрымаць страву кіславатую, а не саладкаватую, замест вяршкоў трэба ўзяць смятану. Можна дадаць яшчэ сухога булёну.

**З кнігі В. Завадскай «Літоўская кухарка», 1854 г.**

**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Віншуем нашых бацькоў** з тым, што цяпер яны сталі бабуляй і дзядулем! Раман і Танька.

**ПРАЦА**

**Гісторык, культуролаг шукае** працу (32 гады, валоданне камп'ютарам). Міхась. Т.: (025) 697–81–91, (029) 392–39–00. lebiedz@tut.by.

**ПРАДАМ**

**Прадам фотаальбом пра беларскі балет** на беларускай і англійскай мовах 1997 года выпуску. 30 000 рублёў. Т.: (029) 776–35–57.

**СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА**

**Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў** гісторыі і культуры і Антон Астаповіч запрашаюць ў сяброўскае падарожжа 20 чэрвеня па маршруце: Мінск–Пераброддзе–Іказнь–Браслаў–Далёкія–Пеліканы–Дрысвяты–Відзы–Відзы Лаўчынскія–Мінск. Даведкі праз тэл.: (+375 29) 111–73–32, 262–73–43

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Што ідзе,
не сыходзячы з месца?

2) Што зімою расце
ўніз галавою?

3) Яе ўсе рэжуць,
б'юць, варочаюць, яна
ўсім за гэта дабром
плаціць.

4) Празрысты,
як шкло, а для акон
не падыходзіць.

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

**Адказы на старонцы 16.**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.



У Мастацкім музеі (Леніна, 20) — «Выстава адной карціны». Дэманструецца класічнае палатно Адольфа Гугеля і Раісы Кудрэвіч «Кастусь Каліноўскі» (1958).



У Рызе прайшоў парад бландзінак.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Русальным (Граным, Праводным, Духавым, Крывым) тыднем, або Русальніцай называецца наступны тыдзень пасля свята Тройцы (Сёмухі). Ён завяршаў сабой вясновы перыяд, прыпадаў на час вясновага буяння расліннасці. Русалле ў вёсках Камуны і Старыя Гарадзяцічы Любанскага раёна.



У Ружанах аднаўляюць велічны палац Сапегаў. Над уваходам з'явіўся герб магнацкага роду з «Пагоняй».




Эратычная акцыя пратэсту ў цэнтры Лондана. Прыгажуні Люсі Кларксан (былая мадэлька, прататып вобраза Лары Крофт) і Вікторыя Айзерман (самая сексуальная вегетарыянка Еўропы) з'явіліся ў аголеным выглядзе непадалёк ад брытанскага парламента. Яны пафарбавалі свае целы ў форму каралеўскіх гвардзейцаў Вялікабрытаніі. Абаронцы жывёл пратэстуюць супраць забойства мядзведзяў, са шкураў якіх шыюць галаўныя ўборы гвардзейцаў.

## Анекдоты

* * *

Аднойчы жабку-падарожніцу занесла бура ў Францыю...

* * *

Запіска пяцігадовай дзяўчынцы: «Будзь разумніцай і слухайся тэлевізара! Мама».

* * *

Першае правіла сацыёлага — ніколі не рабіць апытанне грамадскай думкі ў панядзелак раніцай.

* * *

Калі ўлічыць колькасць выкідаў у сусветны акіян нафты, рыбы хутка пачнуць эвалюцыянаваць у бок з'яўлення ў іх рухавіка ўнутранага згарання.

* * *

Спіць Лукашэнка. Раптам а 3-й ночы званок у дзверы. Адчыняе — там Януковіч на аднойназе падскоквае. Кажа: «Саша, пусці ў прыбіральню, а то я сваю на 50 гадоў Расіі ў арэнду аддаў!»

* * *

Глыбокі сэнс байкі Крылова «Варона і сыр» заключаецца ў тым, што, толькі згубіўшы сыр, варона атрымала свабоду слова.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Бадэн-Бадэн.** Памёр доктар Кох, каторы сваёй працай над навукай шмат зрабіў дабра людзям. Ён першы прыдумаў рабіць людзям прышчэпкі ад дыфтэрыту. Таксама ён адкрыў прычыны сухот.

**«НН» № 21. 1910.**

**«НН»: Што лепш: незалежнасць з Лукашэнкам ці дэмакратызацыя і рынкавыя рэформы цаной страты незалежнасці?**

**Міхаіл Чыгір, былы прэм'ер-міністр Беларусі:** Незалежнасць — гэта самае важнае. Аб'яднацца проста, раз'яднацца і аддаваць дзяржаву будзе цяжэй.

**«НН»: Вы асабіста гатовыя падтрымаць Лукашэнку, калі ён зменіць курс?**

**МЧ:** Я вам скажу больш. Пазатым летам людзі Лукашэнкі прапанавалі мне вярнуцца і працаваць ва ўрадзе. Каб я бачыў, што ён эканоміку пачынае развіваць у іншым кірунку, што будуе дзяржаву на базе прыватнай уласнасці, я даў бы згоду працаваць, але пакуль я нічога гэтага не бачу.

**«НН» № 21. 2000.**

**Шаноўныя чытачы!**

Наступны нумар «НН» выйдзе 15 чэрвеня. Добра Вам адпачыць!

**Адказы да старонкі 15:**

1) Гадзіннік. 2) Лядзяш. 3) Зямля. 4) Лёд.

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф–рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6340.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 01.06.2010.

Замова № 2617.

Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.

Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614

9 771819 161008 10021